Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. СУБОТА № 188 (27553) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

САМААДДАНАЯ МІСІЯ НАСТАЎНІКА

ПЕДАГАГІЧНЫМ РАБОТНІКАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас з Днём настаўніка — святам тых, для каго сэнсам жыцця стала служэнне высакароднай справе асветы і выхавання маладога пакалення.

Прафесія педагога здаўна з'яўляецца адной з самых паважаных у Беларусі. Мы цэнім вашы заслугі ў забеспячэнні высокай якасці айчыннай адукацыі, важкі ўклад у сацыяльна-эканамічны прагрэс краіны, захаванне духоўных і маральных ідэалаў нашага грамадства.

На настаўнікаў і выкладчыкаў сёння ўскладаецца адказная місія — не толькі даць нашым дзецям глыбокія і моцныя веды, але і выхаваць іх у духу грамадзянскасці і патрыятызму, навучыць жыць інтарэсамі краіны, творча думаць і самастойна прымаць рашэнні. Вам пад сілу справіцца з гэтай задачай. Беларускае настаўніцтва з'яўляецца надзейнай апорай дзяржавы, якая робіць усё магчымае для ўзмацнення сацыяльнай абароненасці педагагічных работнікаў і павышэння прэстыжу іх працы.

У сэрцы кожнага з нас не гасне памяць аб любімым настаўніку, чые падтрымка і мудрая парада дапамаглі паверыць у сябе і выбраць правільную жыццёвую дарогу. Мы ўдзячны вам, нашы дарагія настаўнікі, за самаадданую працу, за тую цеплыню і любоў, якія вы шчодра аддаяце вучням.

Перакананы, што вы і ў далейшым будзеце захоўваць слаўныя традыцыі сваёй прафесіі, з уласцівымі сапраўднаму настаўніку энтузіязмам і верай у чалавека сеяць у юных душах зерні ведаў і дабрыні.

Зычу вам моцнага здароўя, нястомнага творчага гарэння, новых працоўных поспехаў, здольных і дапытлівых вучняў, шчасця, дабрабыту і цудоўнага настрою.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

НОВЫ ІМПУЛЬС УЗАЕМАВЫГАДНАМУ ПАРТНЁРСТВУ

Учора завяршыўся афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Казахстан, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Афіцыйныя перагаворы лідараў дзвюх краін прайшлі ў фармаце сам-насам і ў пашыраным складзе. Па іх выніках падпісаны шэраг двухбаковых пагадненняў у розных сферах, у тым ліку прынята дарожная карта развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Казахстанам на 2014—2016 гады.



Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў на перагаворах у Астане абмеркавалі рэалізацыю раней дасягнутых дамоўленасцяў. «Я ехаў сюды, каб, як мы некалі дамовіліся, пракантраляваць нашы даручэнні, якія мы давалі ўрадам і міністрам», — сказаў на пачатку сустрэчы кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што практыка рэгулярных сустрэч лідараў дзвюх краін з'яўляецца вельмі правільным рашэннем, гэта падганяе выканаўцаў у Беларусі і Казахстане да рэалізацыі пастаўленых задач.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што народы дзвюх краін у многім падобныя і прывыклі зарабляць сваёй працай. «І мы як Прэзідэнты стараемся закласці моцную аснову для будучых пакаленняў, для тых, хто прыйдзе пасля нас. Каб тая палітыка, якую мы сёння ажыццяўляем, стала асновай іх дзейнасці. І тое, што мы ў аснову ўзаемаадносін паклалі інтарэсы нашых народаў, дарагога каштуе, гэта беспамылкова, і гэта заўсёды новымі пакаленнямі будзе вітацца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка прапануе Казахстану рэалізацыю сумесных праектаў у сферы транспарту і лагістыкі. Паводле яго слоў, развіццю ўзаемадзеяння з Казахстанам у сферы транспарту і лагістыкі Беларусь надае вялікае значэнне і патэнцыял супрацоўніцтва ў гэтай сферы значна ўзрос з запускам Адзінай эканамічнай прасторы. «У сумесных планах — лагістычныя цэнтры для транспарціроўкі беларускіх і казахстанскіх тавараў еўрапейскім і азіяцкім спажыўцам», — адзначыў Прэзідэнт. «Мы гатовы будаваць лагістычныя цэнтры на граніцы з Еўрасаюзам для вашых тавараў, асабліва збожжа, для продажу ў Еўрапейскім саюзе», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Нурсултан Назарбаеў заявіў, што паміж нашымі дзяржавамі няма ні палітычных, ні эканамічных праблем. Мы саюзнікі і разам будуем новае інтэграцыйнае аб'яднанне. Спадзяюся, што будучы Еўразійскі эканамічны саюз стане выгадным у інтарэсах усіх краін, раўнапраўным эканамічным саюзам, які дасць нам магчымасць яшчэ больш падняць аб'ём тавараабароту», — заявіў Прэзідэнт Казахстана.

Беларусі і Казахстану неабходна максімальна задзейнічаць перавагі АЭП для ўмацавання ўзаемавыгадных адносін, лічыць Прэзідэнт Беларусі. «Казахстан для нас — надзейны сябар і саюзнік. Мы разам будуем унікальнае на постсавецкай прасторы ўтварэнне — Еўразійскі эканамічны саюз, які дасць вялікія магчымасці для развіцця эканомік нашых дзяржаў», — сказаў беларускі лідар. «Нам неабходна максімальна задзейнічаць перавагі АЭП для ўмацавання ўзаемавыгадных адносін паміж нашымі краінамі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, вырашэнню гэтай задачы будзе садзейнічаць зацвярджэнне дарожнай карты двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва на 2014—2016 гады. Гэты комплексны дакумент ахоплівае практычна ўсе сферы двухбаковага ўзаемадзеяння.

У сумеснай заяве прэзідэнтаў змешчана даручэнне ўрадам абедзвюх дзяржаў прыняць вычарпальныя меры па эфектыўным выкананні ў поўным аб'ёме адпаведнага плана, а таксама іншых дамоўленасцяў, дасягнутых у час сустрэчы на вышэйшым узроўні. Агульную каардынацыю сумеснай работы па вырашэнні гэтай задачы кіраўнікі дзяржаў усклалі на сустаршынь міжурадавай камісіі.

Аляксандр Лукашэнка і Нурсултан Назарбаеў таксама пацвердзілі цвёрды намер і ў далейшым цесна каардынаваць сумесныя намаганні па ўсебаковым паглыбленні і пашырэнні беларуска-казахстанскіх адносін. Адзначана неабходнасць прыняцця дадатковых мер для больш поўнага задзейнічання патэнцыялаў дзвюх краін у мэтах эфектыўнай рэалізацыі стратэгіі развіцця беларуска-казахстанскага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Кіраўнікі дзяржаў заклікалі дзелавыя колы да большай інвестыцыйнай актыўнасці на тэрыторыі Беларусі і Казахстана і выказалі гатоўнасць заахвочваць узаемавыгаднае інвестыцыйнае партнёрства.

«ДЫРЫЖОР» ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Настаўнік фізікі і інфарматыкі Аляксандр РУБАНАЎ — сапраўдны гонар не толькі Пліскай сярэдняй школы імя Мікуліча, але і ўсяго Смалявіцкага раёна. Таленавіты малады выкладчык усяго за некалькі гадоў працы ў школе (той, якую, дарэчы, сам скончыў) прыўнёс сучасныя тэхналогіі ў навучанне школьнікаў. Напрыклад, на сваіх занятках педагог актыўна выкарыстоўвае інтэрактыўную дошку. Разам з вучнямі Аляксандр Дзмітрыевіч запусціў творчы праект «Школьнае TV». І, дарэчы, школьны сайт, які ўзнік дзякуючы маладому выкладчыку, некалькі гадоў таму стаў лаўрэатам міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «TIBO» ў намінацыі «Адукацыя і навука».

Смалявіцкі раён.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:

«На гэтым этапе існуе яшчэ вельмі шмат неўрэгуляваных пытанняў у плане стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што Расія ўжо з'яўляецца членам Сусветнай гандлёвай арганізацыі, Казахстан актыўна працуе над членствам у ёй. Хацелася б яшчэ раз звярнуць увагу на важнасць для краіны пытання аб еўразійскай інтэграцыі: у многім гэта будзе вызначаць нашу эканамічную палітыку і ўсе пытанні, звязаныя з эканомікай, рэгуляваць многія віды дзейнасці нашага жыцця. Не трэба апярэджваць падзеі, але гэта і не павінен быць крок назад у параўнанні з тымі дакументамі, якія ў вызначаным парадку ўжо прыняты і ратыфікаваны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.10.2013 г.

Долар ЗША	9110,00	▲
Еўра	12410,00	▲
Рас. руб.	284,00	▼
Укр. грыўня	1112,88	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 11°
Віцебск	+ 7°
Гомель	+ 8°
Гродна	+ 10°
Магілёў	+ 8°
Мінск	+ 9°

Сяргей МАСКЕВІЧ:

«НІХТО Ў ШКОЛЕ НА ПЛАТНЫХ ПАСЛУГАХ НЕ ЗАРАБЛЯЕ»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

6 кастрычніка беларускія педагогі адзначаць сваё прафесійнае свята. А напярэдадні Дня настаўніка ў рэдакцыі «Звязды» прайшла «прамая лінія» з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам. Сяргей Аляксандравіч паспеў адказаць на два дзясяткі пытанняў, якія сёння ва ўсіх на слыху. Больш за ўсё педагогаў, якія тэлефанавалі на «прамую лінію», цікавілі памеры надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі, перспектывы павелічэння заробку і асаблівасці галіновай сістэмы аплаты працы, якая зараз апрабуецца ў Мінску. А бацькі спрабавалі даведацца меркаванне кіраўніка галіны па тых ці іншых пытаннях арганізацыі адукацыйнага працэсу і выхавання школьнікаў. Шмат пытанняў былі дасланы на «прамую лінію» папярэдне. Адказы на найбольш важныя і цікавыя з іх мы змяшчаем на старонках газеты.

СТАР. 2

■ Учынак

«РАБІЛА ЎСЁ, НІБЫ Ў НЕЙКІМ СНЕ...»

Настаўніца Халопеніцкай школы Ірына Старавойтава прадухіліла трагедыю

У той дзень настаўнік-дэфектолаг Халопеніцкай сярэдняй школы, што ў Крупскім раёне, Ірына Старавойтава разам з вадзіцелем Анатолем Асташонкам на школьным аўтобусе збіралі дзяцей у школу. У першай вёсцы ў салон зайшлі чатыры школьнікі, астатніх бацькі сваім транспартам адвезлі ў Халопенічы.

Ірына Мікалаеўна ўладкавалася на першым сядзенні. Сядзела ў паўабарота, каб не выпусціць з поля зроку дзяцей, і адначасова слухала кіроўцу, які расказваў пра тое, як удала схадзіў у грыбы. Ды і сама Ірына Уладзіміраўна — заўзятая аматарка грыбнога палявання.

— Анатоль Уладзіміравіч ніколі не скардзіўся на здароўе, заўжды добра сябе адчуваў, і ў той дзень быў у прыўзнятым настроі, — згадвае Ірына Старавойтава. — І раптам змоўк на паўслове. Я адчула няладнае і рэзка павярнулася да яго. Вадзіцель усім целам заваліўся на руль, а аўтобус каціўся з горкі ў кювет. Адной рукой я схапілася за баранку, каб выраўнаваць рух аўтобуса, а другой прытрымлівала цела вадзіцеля. Як толькі мінулі невялікі масток цераз рэчку, хутка выняла ключ запальвання, і аўтобус са страшным ровам спыніўся. У выніку былі заблакіраваны пярэднія дзверы, дзяцей удалося вывесці цераз заднія, запасныя.

Пасля жанчына выклікала «хуткую дапамогу», міліцыю і патэлефанавала дырэктару школы Ірыне Іванаўне Сабалеўскай: «Я выратавала дзяцей і аўтобус, а Уладзіміравіча выратаваць не змагла...», — толькі і змагла вымавіць.

СТАР. 2

ЗЛОВІШ РАКА — АДПУСЦІ!

З 15 кастрычніка па 15 ліпеня на ўсіх вадаёмах краіны ўводзіцца забарона на лоўлю вузкапалага рака. Такая мера, каб колькасць яго хутка аднаўлялася, дзейнічае ў перыяд ліньку.

— У выпадку, калі рыбалоў вылавіць у азначаны прамежак часу рака, ён павінен яго адпусціць, — паведаміў старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей. — Бліжэйшы «сваяк» вузкапалага рака — шыракапалы занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Яго лоўля катэгарычна забаронена. Адрозніць гэтыя два віды ракаў дастаткова проста: шыракапалы, у параўнанні з вузкапалым, мае больш кароткія і тоўстыя клюшні.

У астатні час, калі лоўля вузкапалага рака дазволена, катэгарычна забараняецца здабываць больш за 30 штук у дзень на чалавека. Забаронена і лоўля з выкарыстаннем ракаловак у колькасці больш за тры штукі (даўжынёй звыш 100 см з дыяметрам уваходнай адтуліны больш за 70 см і ячэйкай менш за 22 мм).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРАКАМІСІЯ АБВІНАВАЧВАЕ «ГАЗПРАМ»

Еўрапейскія ўлады рыхтуюцца прад'явіць «Газпраму» абвінавачванне ў злоўжыванні дамінуючым становішчам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, за што расійскаму газаваму манапалісту можа пагражаць штраф у памеры да 15 млрд долараў. «Газпрам» таксама падазраюць ва ўсталяванні несправядлівых цэн на сваю прадукцыю. Член Еўракамісіі адзначыў, што расследаванне вядзецца на падставе скаргі Літвы, але яго ахоп з'яўляецца больш шырокім і ўключае Польшчу, Чэхію, Славакію, Венгрыю і Балгарыю. У мінулым годзе ЕК пачала афіцыйнае расследаванне па факце парушэння «Газпрамам» антыманапольнага заканадаўства. Калі парушэнні будуць даказаны, «Газпрам» аштрафуюць на 10% гадавога абароту. Але калі ўмовы канкурэнтнага рынку парушаліся на працягу некалькіх гадоў і нанеслі шкоду галіне, кампанія заплаціць 30% гадавой выручкі.

ВІНО ВЫРАБЛЯЛІ 6 ТЫСЯЧ ГАДОЎ ТАМУ?

Падчас раскопак у Грэцыі археолагі знайшлі рэшткі віна, якому налічваецца 6000 гадоў. Гэта самае старое віно, якое калі-небудзь знаходзілі ў Еўропе ў дагістарычным селішчы. Знаходка зроблена на раскопках на паўднёвым усходзе ад горада Драма ў грэчаскай вобласці Усходняя Македонія. Адкрыццё мае вялікае значэнне, таму што мяняе ўяўленне пра жыццё людзей у перыяд неаліту, у тым ліку і аб спажыванні імі віна. «Да гэтага часу мы ведалі, што ўжо ў бронзавым веку (прыкладна з 1200 да н. э.) людзі пілі віно. А зараз мы высветлілі, што працэс вытворчасці віна быў вядомы задоўга да гэтага перыяду — з 4200 года да нашай эры», — заявілі археолагі.

МІЛЬЁН ЗВАЛІЎСЯ З НЕБА

У Балівіі з неба над дэпартаментам Санта Крус на ўсходзе краіны на працягу некалькіх хвілін сыпаліся грашовыя купюры на суму прыкладна ў мільён долараў. На пачках банкнот, якія зваліліся з неба, стаяла пячатка аднаго з банкаў Парагвая. Купюры былі спецыяльна скінуты з самалёта, які ляцеў на невялікай вышыні. Паліцыя падазрае, што ў справе замешаны мясцовыя мафіёзныя кланы, якія займаюцца кантрабандай наркотыкаў. Банкноты, запакаваныя ў 26 пластыкавых пакетаў, наркагандляры павінны былі падабраць на зямлі. Аднак план праваліўся, злачынцаў апярэдзілі супрацоўнікі антынаркатычнай паліцыі, затрыманы трое падазраваных. Балівія разам з Калумбіяй і Перу ўваходзіць у лік найбуйнейшых вытворцаў какаіны ў свеце.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 13188

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НАЕЗД НА КАПІТОЛІЙ

У Вашынгтоне днём 3 кастрычніка жанчына за рулём чорнага Infiniti паспрабавала прарвацца праз вароты на тэрыторыю рэзідэнцыі прэзідэнта ЗША. Пацярпеўшы няўдачу, яна накіравалася ў бок Капітолія.

Паліцыя пачала праследаванне і заблакіравала машыну побач з будынкам Кангрэса. Усяго ў пагоні ўдзельнічала 20 паліцэйскіх машын. У выніку паліцыя адкрыла стральбу, жанчына была забіта. Траўмы атрымалі супрацоўнік Сакрэтнай службы і паліцэйскі. Аднагадовае дзіця (дзяўчынка, якая знаходзілася ў салоне аўтамабіля) цудам не пацярпела. Па апошніх звестках, зброі ў жанчыны не было. Як высветлілася, аўтамабілем кіравала 34-гадовая Мірыям Кэры з горада Стэмфард, штат Канектыкут. Тэлеканалу ABC удалося звязацца з яе маці, якая паведаміла, што дачка, якая працавала стаматолагам, пакутавала ад паслярадавай дэпрэсіі. Сімптомы памутнення розуму з'явіліся ў Кэры пасля нараджэння дачкі ў жніўні 2012 года, паведаміла яна. Маці Мірыям Кэры таксама дадала, што яе дачка ў сувязі з паслярадавай дэпрэсіяй некаторы час ляжала ў бальніцы. Пры гэтым яна заявіла, што не разумее, якім чынам яе дачка днём 3 кастрычніка апынулася ў Вашынгтоне.

КАРАТКА

Фізічныя асобы за верасень прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на $726,2 млн (за жнівень — $735,6 млн) у эквіваленце, купілі — $1 млрд 58,1 млн (за жнівень — $903,3 млн). Такім чынам, чыстая купля валюты склала $331,9 млн (у жніўні — $167,7 млн).

Вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі рэкамендуюць дадаць у Чырвоную кнігу Беларусі 48 відаў жывёл і 18 відаў раслін.

У Гродзенскай вобласці плануецца стварыць вытворчасць гнуткіх і малых сонечных панэляў.

У Беларусі павышаюцца мінімальныя стаўкі платы за арэнду паляўнічых угоддзяў. Яны цяпер будуць прывязаныя да памеру базавай велічыні. Кошт арэнды 1 га лясных паляўнічых угоддзяў павялічваецца да Br260 тыс. (2 базавыя велічыні), кошт арэнднай платы за 1 га палявых і воднабалотных угоддзяў — да Br65 тыс. (0,5 базавай велічыні). Да Br30 тыс павялічваецца кошт паляўнічай пуцёўкі на 1 дзень палявання, на сезон палявання — да Br200 тыс.

ЯКІЯ ВАШЫ САМЫЯ ЯСКРАВЫЯ ЎРАЖАННІ АД ЛЕТА?

Інга ВОЮШ, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ:

— Сёлета на маю долю выпаў маштабны рамонт. Як зазвычай, наняць людзей не было грошай, таму давялося асвойваць сумежныя прафесіі самастойна. Паклейка шпалер і афарбоўка чаго заўгодна — гэта для мяне не праблема. А тут давялося тынкаваць і шпакляваць сцены вясковай хаты, рабіць раствор. Таму самае яркае ўражанне гэтага лета, калі ў мяне нарэшце атрымалася чыста, роўна і без хібаў нанесці шпаклёўку.

Дзмітрый КЛЯПКОЎ, настаўнік хіміі Мінскага раённага ліцэя:

— Я займаюся гістарычнай рэканструкцыяй, таму весела правесці лета — гэта не праблема для мяне. Бо лета — самы сезон для ўсялякіх фестываляў і выездаў. Сёлета ездзіў на фэст у Польшчу і Літву. На такіх фестывалях я на тыдзень акунаюся ў Сярэднявечча. Калі быў у Польшчы, то здарыўся выпадак, які запомніцца мне надоўга. На адным з бугуртаў адбыўся казус: я наступіў на шчыт сябра і спатыкнуўся. У выніку сваім жа мячом зламаў сабе зуб. Вось такое траўматычнае лета ў мяне атрымалася.

Кацярына ПАРШЫКАВА, студэнтка хімічнага факультэта БДУ:

— Гэтым летам я паспрабавала сябе ў ролі важатай у дзіцячым летніку. За тры тыдні, якія правяла ў ім, мне здалося, што я пастарэла на некалькі гадоў. Мне давялося не толькі адказваць за жыццё і здароўе дзетак, але і адказваць на ўсе іх пытанні, «разруліваць» канфлікты і, што самае важнае, мне неабходна было быць для іх прыкладам. Калі я вярнулася дадому, зразумела, як жа цяжка і адначасова цікава ісці па «педагагічнай сцежцы». Таму мой летні вопыт даў мне глебу для роздумаў над сваёй будучай прафесіяй.

Падрыхтавала Вікторыя ЧАПЛЕВА.

■ Курсавая розніца

ЧАС ДЛЯ СПЕКУЛЯЦЫЙ

— Я спадзяюся, што матэрыяльна вы не вельмі пацерпіце, білеты ў цырк не прападуць?
— Што вы! Я «заганю» іх па спекулятыўнай цане.
— Ну, у вашай практычнасці я ніколькі не сумнявалася...

Памятаеце гэты дыялог у адным вельмі вядомым фільме? У тыя часы, калі ён здымаўся, спекулянтаў і сапраўды было шмат. Але ж і зараз яны нікуды не падзеліся — толькі пачалі займацца больш маштабнымі спекуляцыямі.

Злучаныя Штаты так дагэтуль і не вырашылі праблему са сваім дзярждоўгам і фінансаваннем бюджэтных структур. Як і прагназавалася раней, дамоўленасці паміж рэспубліканцамі і дэмакратамі (адпаведна, паміж амерыканскім парламентам і прэзідэнтам) трэба чакаць толькі ў крайні тэрмін — каля 17 кастрычніка. У краіне ўжо не працуе некалькі другасных дзяржустаноў, работнікі якіх былі адпраўлены ў неаплатныя адпачынкі. Закрыліся нацыянальныя паркі і іншыя славутасці, не працуюць урадавыя інтэрнэт-рэсурсы і гэтак далей. Увесь фінансавы свет назірае за гэтым спекулятыўным дзействам, нервова дрыгаючыся. Час для вялікіх спекуляцый надышоў. Хтосьці, відаць, вельмі хоча зарабіць, таму і няма канца незразумелым дзеянням адной з найбуйнейшых эканомік свету. Еўрапейская валюта пры гэтым добра «паднімаецца». Гэты рост не можа перакрыць нават свая, еўрапейская, не самая лепшая эканамічная статыстыка.

Шкада, што мы не можам неяк паўплываць на сусветныя тэндэнцыі: занадта маленькая для гэтага ў нас эканоміка. Але гэтыя тэндэнцыі добра даходзяць да нас, выклікаючы паслабленне рубля, якому і так зараз цяжка. Такім чынам, долар за гэты тыдзень падаражэў на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9110. Еўра ўвабраў у сябе яшчэ 160 рублёў (плюс 1,3%) і каштуе цяпер 12410. А валюта нашых суседзяў «паднялася» на 3,5 рубля (плюс 1,3%) да 284.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Блізкая ўлада

НОВАЯ КВАТЭРА, СТАРЫ ДОМ...

Менавіта з жыллёвымі праблемамі давялося разбірацца на прыёме грамадзян старшыні Магілёўскага аблвыканкама Пятру РУДНІКУ.

Шматдзетная маці, якая працуе на прадпрыемстве «Магілёўхімвалакно», звярнулася да кіраўніка вобласці з просьбай дапамагчы разабрацца з ільготамі і фінансавымі магчымасцямі на пабудову новага жылля. Яна мае траіх дзяцей, жыве ў блоку інтэрната, працуе пакаёўкай на базе адпачынку, атрымлівае заробак у 2 мільёны рублёў плюс дапамогу на дзяцей, таму матэрыяльнае становішча гэтай сям'і нельга назваць трывалым.

Дзяржава, вядома, клапоціцца пра новае жыллё для шматдзетных сем'яў, таму жанчына можа быць па-за чаргой уключана ў спіс будаўнічага кааператыву: яна атрымае льготны крэдыт, а большую частку затрачаных на пабудову жылля грошай кампенсуе бюджэт. Тым не менш, і пры гэтых спрыяльных умовах застаецца сума грошай, якую павінна ўнесці сама сям'я, і гэта не адзін мільён рублёў, і нават не два-тры. Разлічваць шматдзетная маці можа толькі на сябе, таму яна ўважліва слухала парады кіраўнікоў, якія вынікалі з разлікаў, праведзеных тут жа.

Пётр Руднік прапанаваў заяўніцы будаваць меншую па плошчы і колькасці пакояў кватэру, а таксама перавесціся на іншую працу ў «Магілёўхімвалакно», дзе быў бы большы заробак. Сёння прадпрыемства мае патрэбу ў кадрах некаторых спецыяльнасцяў, і пасля перанавучання можна атрымліваць большы заробак і мець, адпаведна, большыя магчымасці — для сябе і сваіх дзяцей.

Губернатар таксама настойліва параіў прадпрыемствам у дачыненні да сваіх лепшых работнікаў, якія маюць патрэбу ў новым жыллі, скарыстацца сістэмай будаўнічага зберагання, якую прапануе Беларусбанк. Для таго, каб атрымаць крэдыт на будаўніцтва, трэба назбіраць на разліковым рахунку 25% ад неабходнай сумы. Якраз яе і можа даць прадпрыемства — як беспрацэнтную пазыку добраму працаўніку. Шляхі вырашэння праблемы ёсць — трэба толькі думаць і працаваць, упэўнены Пётр Руднік.

Быць больш ініцыятыўнымі заклікаў кіраўнік вобласці і іншых заяўнікаў, якія клапоцяцца пра капітальны рамонт свайго дома. На вуліцы Касманаўтаў у Магілёве рамантуюць шмат старых дамоў, але да дома № 4 справа так пакуль і не дайшла. Жыхаркі яго прыйшлі на прыём да Пятра Рудніка, каб спытацца: чаму менавіта іх дом, насуперак ранейшым абяцанням кіраўніцтва гарвыканкама, выкінуты з тытульнага спіса на капітальны рамонт?

Старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦУМАРАЎ растлумачыў, што сёлета гэты дом сапраўды выпаў са спіса, таму што ўлады вырашылі ў 2013 годзе завяршыць усе «даўгабуды» ў капітальным рамонце, а далей пачаць «з чыстага ліста» і не даваць больш пустых абяцанняў, бо грошай у бюджэце на ўсё не хапае. З гэтай прычыны ў спіс наступнага года на капрамонт у Магілёве трапляюць толькі два дзясяткі дамоў, і сярод іх якраз будзе № 4 па вуліцы Касманаўтаў.

Між тым жанчыны паскардзіліся, што калісьці на доме зрабілі новы дах, але не працуе сістэма адтоку вады, таму сцены вільготныя, і дому патрабуюцца не толькі балконы-лоджыі, але і тэрмарэнавацыя. Фотаздымкі кватэр пераканалі Пятра Рудніка, што такія работы сапраўды патрабуюцца. Разам з тым тэрмарэнавацыя зробіць кошт рамонту дома на палову большай, а гэта некалькі мільярдаў рублёў. Таму, лагічна, улады запыталіся ў жыхароў дома: а што яны самі могуць зрабіць для таго, каб ім жылося больш утульна і камфортна?

Размова ідзе не толькі аб грашовым удзеле ў рамонтных работах: рабіць гэта, натуральна, варта ў меру магчымасцяў жыхароў, але ўсё ж такі свой, асабісты, уклад у справу забяспечыць жыхарам дома больш трывалыя пазіцыі ў лісце чакання рамонту. Ёсць таксама патрэба ў ініцыятыве навядзення парадку ў дварах і пад'ездах. Што ж, жыхары дома № 4 па вуліцы Касманаўтаў зусім не супраць добрай справы: у іх ёсць вопыт збірання грошай на фарбу для пад'ездаў, устаноўкі сучасных аконных блокаў. Жанчыны не сталі адмаўляцца ад удзелу ў суботніку.

— Там, дзе наводзяць парадак і сочаць за ім — не псуюць выгляд і не кідаюць смецце, — упэўнены старшыня аблвыканкама.

Пётр Руднік таксама параіў уладам Магілёва правесці агульнагарадскі суботнік напярэдадні міжнароднага фестывалю «Залаты шлягер», які хутка распачнецца ў абласным цэнтры. Камунальным службам будзе дарэчы дапамога гараджан.

Ілона ІВАНОВА

«РАБІЛА ЎСЁ, НІБЫ Ў НЕЙКІМ СНЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У такіх выпадках людзі сцвярджаюць, што перад вачыма пранеслася ўсё жыццё. Нічога такога са мной не адбывалася, не было ні істэрыкі, ні слёз, проста быў шок. Заплакала толькі дома, калі асэнсавала, якое няшчасце магло адбыцца з дзеткамі, — прызналася Ірына Мікалаеўна.

А тады жанчына бегала ад дзяцей да кіроўцы. Першых супакойвала, другому спрабавала аказаць дапамогу. «Але калі ён захрыпеў, зразумела, што гэта ўсё. Апошнія хрыпы, калі чалавека пакідае жыццё, адбіліся ў маёй памяці назаўжды: на маіх руках памерла мама», — мая суразмоўца імкнецца схаваць слёзы.

«Хуткая» прыехала літаральна праз 5-7 хвілін, медыкі пачалі аказваць дапамогу кіроўцы, але было позна: адарваўся тромб, які і прывёў да імгненнай смерці. Другая машына хуткай дапамогі забрала дзяцей, якія перажылі страшэнны стрэс.

— Далёка не кожны прафесійны вадзіцель на вашым месцы так імгненна адрэагаваў бы на сітуацыю. А тут ні разгубленасці, ні істэрыкі. Што дапамагло сканцэнтравацца, ацаніць абстаноўку? — не перастаю здзіўляцца мужнасці Ірыны Мікалаеўны.

— Нават не ведаю, усё рабіла нібы ў нейкім сне, але, як аказалася потым, дзейнічала правільна. У мяне нават няма вадзіцельскага пасведчання, думаю ў гэтым месяцы запісацца на курсы, — кажа яна.

Праўда, падлеткам тры сезоны запар падчас жніва Ірына працавала памочнікам камбайнера ў свайго бацькі Мікалая Дзям'янавіча Старавойтава, які быў вельмі паважаным чалавекам, перадавіком, ардэнаносцам, пра яго расказваецца ў Кнізе «Памяць» Крупскага раёна. На поле часта прыязджалі журналісты, а тата прасіў: маўляў, пакажы, дачушка, які ты ў мяне памочнік. І дзяўчынка садзілася за штурвал камбайна, каб прадэманстраваць майстэрства. Можа набытыя навыкі і дапамаглі настаўніцы справіцца, узяць сябе ў рукі ў складаных абставінах.

— Ведаеце, для мяне 26 чысло нейкае містычнае, нешта заўсёды здараецца ў маім жыцці: добрае ці дрэннае. 26 жніўня нарадзілася я, 26 ліпеня — мая лепшая сяброўка, 26 студзеня ў мяне з'явілася дачка, 26-га памёр мой тата, 26 верасня падала заяву на развод з мужам, — прызналася мая суразмоўца. — А ў той дзень я не прадчувала бяды. І толькі калі міліцыянер працягнуў пратакол здарэння і вымавіў: «Падпішыце 26-м», — мяне нібы кіпнем апарылі», — прызнаецца Ірына Старавойтава.

Жыццё ніколі не песціла гэтую прыгожую жанчыну. Калі вучылася ў дзясятым класе, памёр бацька, пазней не стала маці. У сям'і падрастаў малодшы брат, адказнасць за выхаванне якога ўзяла на сябе. Даводзілася разлічваць толькі на свае сілы. Можа, адсюль і мэтанакіраванасць у дасягненні мэты, энергія, жыццялюбства і спагада да людзей, імкненне прыйсці ім на дапамогу. Вось ужо 9 гадоў выкладае ў Халопеніцкай сярэдняй школе, завочна закончыла педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка па спецыяльнасці настаўнік-дэфектолаг. Усё жыццё яна марыла быць настаўніцай фізкультуры. Ды так і не навучылася плаваць, што і стала перашкодай для паступлення. Але пра гэта Ірына Мікалаеўна не шкадуе. «Маё прызванне — быць настаўнікам, — кажа яна. — І я ім стала».

— Сапраўдным педагогам, — дадае дырэктар школы Ірына Сабалеўская. — Ірына Мікалаеўна заўсёды напярадзе са сваім класам, як у прафесійным плане, так і ў спартыўных дасягненнях.

Але галоўнае дасягненне, якое цешыць мацярынскае сэрца, — дачка Дзіяна. Дзяўчына закончыла школу з залатым медалём, вучыцца на другім курсе педагагічнага ўніверсітэта імя Танка, дзе атрымлівае спецыяльнасць настаўніцы пачатковых класаў. Ірына Мікалаеўна сваім прыкладам выхоўвала дачку. І выросла яна прыгажуняй, разумніцай, дбайнай гаспадыняй. Знаёмыя маці заўсёды казалі пра яе: «Дарослая не па гадах».

У суседняй вёсцы жыве і самы блізкі чалавек — родная цётка Сцеша. Хварэе часта, вось і сёлетняй зімой ляжала ў бальніцы. А пляменніца амаль штодзень ездзіла, каб прапаліць печку, ды пакарміць двух сабак, ката і курэй.

У Ірыны Мікалаеўны часта дапытваюцца, ці не сумна прыгожай маладой жанчыне жыць адной. А ёй няма калі сумаваць: дом, работа, дзеці, агарод, а летам — хатнія нарыхтоўкі на зіму. «Радуюся кожнай вольнай хвіліне, калі ўдаецца пабыць адной», — усміхаецца яна.

Але ўсмешка раптоўна знікае з вуснаў: «Вось толькі Анатоля Уладзіміравіча не вернеш. Нядаўна ён знайшоў багатую мясціну апенек, але з'явіўся канкурэнт з вялікім, як цялё, сабакам, і ён вымушаны быў пайсці. Мне казаў: «Я туды абавязкова вярнуся!». Не вернецца...».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, *Крупскі раён.*

«НІХТО Ў ШКОЛЕ НА ПЛАТНЫХ ПАСЛУГАХ НЕ ЗАРАБЛЯЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Андрэй Генадзьевіч Шандроха, настаўнік геаграфіі, гімназія № 30 г. Мінска, кіраўнік раённага метадычнага аб'яднання:

— У маі 2013 года я здаў кваліфікацыйны экзамен на пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі. І ў сувязі з гэтым хацелася б даведацца: ці будзе павялічана настаўнікам надбаўка за вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю пасля завяршэння тэрміну пераатэстацыі (гэта значыць, пасля 1 верасня 2014 года) і наколькі істотна яна будзе адрозніваецца, напрыклад, ад даплаты за першую катэгорыю?

— Назваць дакладна, наколькі вырасце даплата, я пакуль не магу. Магу толькі абяцаць, што яна будзе павялічана, прычым гэта будзе істотнае павелічэнне. Праект дакумента падрыхтаваны. Але пакуль ён не будзе зацверджаны, лічу, што канкрэтныя лічбы называць заўчасна...

Алег Якубоўскі, г. Мінск:

— Сяргей Аляксандравіч, вы ў нядаўнім сваім выступленні сказалі, што настаўнікі фізіка-матэматычнага профілю будуць атрымліваць даплаты да асноўнага заробку. Хацелася б пачуць вашы аргументы на карысць такога рашэння. Няўжо ў іх нейкія асаблівыя ўмовы работы? Або на філолагаў, біёлагаў ці хімікаў кладзецца меншая нагрузка? Тым больш, што той жа курс школьнай матэматыкі застаецца нязменным, а біёлагам і геаграфам трэба пастаянна клапаціцца пра тое, каб не адстаць ад развіцця сучаснай навукі і не выпасці з інфармацыйнага поля. І калі настаўнік матэматыкі можа працаваць у адной паралелі, то геаграфу трэба рыхтавацца да ўрока і ў 8-м, і ў 9-м, і ў 10-м класах. І ўвогуле ім вельмі праблематычна набраць 20 гадзін на стаўку. Ці вы збіраецеся «рублём» утрымліваць у школе дэфіцытных прадметнікаў? А калі заўтра ў дэфіцыце акажуцца, напрыклад, настаўнікі замежных моў, што вы будзеце рабіць?

— Калі я казаў пра магчымыя даплаты, размова ішла аб эксперыменце па апрабацыі галіновай сістэмы аплаты працы педагогаў. У рамках эксперыменту школам прадастаўлена магчымасць укараненне такіх галіновых даплат. Сапраўды, мы прапанавалі павышальныя каэфіцыенты, якія ўлічваюць спецыфіку выкладання асобных прадметаў. Але апошняе слова — за ўдзельнікамі эксперыменту. Вы справядліва заўважылі, што географам праблематычна набраць гадзіны на поўную стаўку, таму некаторыя настаўнікі геаграфіі вымушаны працаваць паралельна ў некалькіх школах. Дык чаму б і не ўстанавіць такому спецыялісту надбаўку? Я прыхільнік таго, каб уводзіць даплаты з улікам спецыфікі канкрэтнага рэгіёна і канкрэтнай школы. Патлумачу, што я маю на ўвазе. У адной школе праца матэматыка і сапраўды можа быць руцінай: прыйшоў, правёў урок, праверыў вучнёўскія сшыткі і ўсё. А ў іншай установе адукацыі настаўнік матэматыкі, фізікі ці інфарматыкі дапамагае іншым укараняць і выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі, адказвае за школьны сайт і гэтак далей. Тое ж тычыцца і філолагаў.

Святлана, г. Мінск:

— Добры дзень! Сяргей Аляксандравіч, дазвольце павіншаваць вас з надыходзячым святам...

— Дзякуй, Святлана, вы — першы чалавек, які ў гэтым годзе віншуе мяне з Днём настаўніка....

— Мы вельмі ўдзячныя ўсім педагогам за іх складную працу: хацелася, каб у настаўнікаў і заробак адпавядаў укладзеным намаганням. Але ў мяне ёсць да вас два пытанні. Скажыце, што можна зрабіць з некіруемым дзіцём у класе? Мы прыводзім сваіх дзяцей у школу, каб яны вучыліся. Усе жадаюць вучыцца, акрамя аднаго хлопчыка: ён не проста перашкаджае іншым дзецям, а паводзіць сябе ў дачыненні да сваіх аднакласнікаў агрэсіўна. Зрывае ўрокі... Скажыце, што мы можам зрабіць, каб засцерагчы сваіх дзяцей ад гэтага хлопчыка?

— Сітуацыя складаная і, на жаль, не адзінкавая. Але рэцэптаў, як з яе выйсці, у мяне няма. Я ўпэўнены, што задача школьных педагогаў, псіхолагаў і дзіцячых грамадскіх арганізацый — шукаць падыходы да такіх дзяцей. А калі гэта не атрымліваецца, то ў больш старэйшым узросце падлетак рызыкуе трапіць ужо ў поле зроку міліцыі.

— Я прапаную паглядзець на сітуацыю пад іншым вуглом. Мы ўсе — рознымі, і дзеці ў нас — рознымі, але каб не было хаосу, як у дзяржаве, так і ў школе (дазвольце мне правесці такую паралель), усе павінны жыць па законах і прытрымлівацца ўстаноўленых правілаў. Напэўна, у школе таксама павінен дзейнічаць закон, на падставе якога дзеці абавязаны паводзіць сябе так, каб не перашкаджаць іншым навучацца.. Магчыма, трэба спачатку паспрабаваць уздзейнічаць на дарослых? Бацькоў такіх праблемных дзяцей трэба часцей выклікаць да дырэктара, на педсаветы, на сходы бацькоўскіх камітэтаў... Бо складваецца ўражанне, што многія бацькі таксама не разумеюць, як іх дзіця павінна паводзіць сябе ў школе... Я лічу, што дзяцей яшчэ са школьных гадоў трэба навучыць паважаць закон і інтарэсы іншых...

— Святлана, зараз рыхтуюцца папраўкі для ўнясення ў Кодэкс «Аб адукацыі». І, наколькі я ведаю, ёсць прапановы знізіць узрост, калі да вучня можна будзе прымяняць меры дысцыплінарнага спагнання. Пакуль што, згодна з Кодэксам, дысцыплінарнае спагнанне можна прымяніць да навучэнца толькі з 14 гадоў. Але педагогі ведаюць, што ў старшых класах заўвага або вымова, зробленыя вучню, ужо не маюць такога эфекту, як, скажам, заўвага, зробленая пяцікласніку. Існуюць таксама прапановы ўзмацніць адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей. І больш дакладна гэта прапісаць у нарматыўнай базе, якой пакуль не хапае. Таму ёсць над чым падумаць...

— Сяргей Аляксандравіч, мяне цікавіць таксама, як нам ставіцца да платных адукацыйных паслуг у школе. Як нам іх успрымаць: як рэпетытарства або як фінансавую падтрымку бюджэту?

— Гэта дадатковая магчымасць надаць больш увагі нейкім асобным прадметам з улікам індывідуальных схільнасцяў і інтарэсаў дзіцяці. Ніхто на гэтым не зарабляе. А сродкі ад аказання платных паслуг ідуць на аплату працы педагога, а не ў бюджэт. Але для гэтага педагог дадаткова працуе, займаецца з вучнямі індывідуальна.

— Дапусцім, але калі я іду ў краму і набываю нейкі тавар — яго якасць мне гарантуецца. А як быць з платнымі паслугамі ў школе?

— Школа таксама гарантуе якасць, але калі ў вас ёсць нейкія сумненні, ніхто не забараняе шукаць аналагічныя магчымасці за сценамі школы. Вы можаце прыйсці ў краму, там вам штосьці не спадабалася, і вы шукаеце элітны супермаркет, які па ўсіх параметрах вас задаволіць. Тое ж самае магу сказаць і пра бацькоў. Яны будуць выкарыстоўваць усе магчымасці, каб павысіць шанцы свайго дзіцяці на паступленне. Гэта іх права...

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.
(Працяг тэмы — у наступных нумарах «Звязды».)

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

БУДЗЕ РАСКРЫТАЯ І «ЛІДСКАЯ СПРАВА»

Беларускія сышчыкі, як і іх калегі з многіх краін СНД, адзначаюць сёлета 95-годдзе крымінальнага вышуку. У 1918 годзе ў гэты дзень НКУС РСФСР прыняў Палажэнне аб савецкім крымінальным вышуку, органы якога ствараліся ў гарадах з насельніцтвам не менш за 40-45 тысяч чалавек «для аховы рэвалюцыйнага парадку шляхам сакрэтнага расследавання злачынстваў крымінальнага вышуку і барацьбы з бандытызмам».

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы на ўрачыстым сходзе ветэранаў, супрацоўнікаў вышуку і членаў іх сем'яў лепшыя сышчыкі атрымалі ўзнагароды з рук кіраўніцтва МУС.

— Крымінальны вышук як адно з вядучых аператыўных падраздзяленняў органаў унутраных спраў вялікую ўвагу надае міжнароднаму супрацоўніцтву, бо злачыннасць не мае межаў, — сказаў **першы намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі — начальнік крымінальнай міліцыі Валянцін МІХНЕВІЧ.** — Сёння свята, аднак раніцай мы абмяркоўвалі рабочыя пытанні. Шэраг спраў сёння знаходзяцца на кантролі. У тым ліку «лідская справа» — забойства дзвюх супрацоўніц магазіна 15 верасня. Да расследавання падключаны лепшыя сышчыкі крымінальнага вышуку, і мы раскрыем гэта злачынства... Вялікая ўвага, паводле слоў Валянціна Міхневіча, надаецца сёння міжнароднаму супрацоўніцтву. МУС Беларусі пастаянна ўзаемадзейнічае са сваімі калегамі з суседніх краін. Таму павіншаваць беларускіх сышчыкаў прыехалі прадстаўнікі Літвы і Украіны. Даслаў свае віншаванні і расійскі бок. **Старшыня ветэранскай арганізацыі МУС Віктар ПІСКАРОЎ** нагадаў, якім цяжкім і ахвярным быў пачатак стварэння службы крымінальнага вышуку. Так, у гады вайны ў партызанскім руху ўзялі ўдзел каля 2 тысяч такіх супрацоўнікаў. 200 з іх загінулі ў баях з нямецкімі захопнікамі. Складаная старонка — і барацьба пасля вайны, калі на тэрыторыі Беларусі дзейнічала каля 300 бандыцкіх фарміраванняў, якія аб'ядналі звыш 20 тысяч бандытаў. За барацьбу з бандытызмам у выніку ўзнагародзілі каля 1,5 тысячы чалавек.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СКУЛЬПТУРЫ Ў ПАДАРУНАК ГОРАДУ

Скульптары з Мінска, Магілёва і Салігорска Уладзімір Піпін, Карней Аляксееў, Аляксандр Бацвінёнак, Уладзімір Ламейка і Ігар Засімовіч па запрашэнні свайго гродзенскага калегі Уладзіміра Панцялеева прыехалі папрацаваць у горад над Нёманам. І пакінуць там у падарунак свае работы.

Ідэю пленэра (ён доўжыўся месяц) падтрымалі мясцовыя ўлады, базу для працы ў вёсцы Пушкары скульптарам прадаставіла прадпрыемства «Будоўля», якое спецыялізуецца на апрацоўцы натуральнага каменю, а матэрыял для творчасці шукалі ў тутэйшых мясцінах. Прырода аказалася шчодрай на выдатныя валуны, і ў выніку з'явіліся скульптуры «Гарадзенская восень», «Арфей і Эўрыдыка», «Муза мастацтва», «Пятрушка», «Песня пра Каложу», «Камень для пацалункаў»... Мяркуецца, што яны «атрымаюць прапіску» ў розных месцах горада ў наступным годзе, калі Гродна будзе культурнай сталіцай Беларусі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СУСЕДЗІ ВЫРАТАВАЛІ ПЕНСІЯНЕРА З СЫНАМ

У Віцебску з трохпакаёвай кватэры, якая гарэла, суседзі выратавалі пенсіянера з сынам.

— Пажар пачаўся ў кватэры на чацвёртым паверсе дзевяціпавярховага жылога дома на вуліцы П. Броўкі. Суседзі да прыезду пажарных вывелі з ахопленай полымем кватэры 64-гадовага гаспадара і яго 39-гадовага сына, а выратавальнікі эвакуіравалі дзесяць чалавек, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. У выніку пажару ў пакоі знішчана маёмасць, у кватэры закураны сцены, столь. Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні ў нецвярозым стане.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АБАКРАЛА БАНК, У ЯКІМ ПРАЦАВАЛА

Следчы камітэт пачаў крымінальную справу ў дачыненні да супрацоўніцы БТА-банка. Жанчына падазраецца ў тым, што прысвоіла велізарную суму грошай, што належыць фінансавай установе.

32-гадовая супрацоўніца банка займала пасаду спецыяліста па аказанні рознічных банкаўскіх паслуг. Паводле папярэдніх даных следства, яна выкарыстала сваё службовае становішча і прысвоіла 120 тысяч еўра, 126 тысяч долараў і 1,47 мільёна расійскіх рублёў. Падазраваная затрымана. Ёй пагражае да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Надзея ДРЫЛА.

КАНФІСКАВАЛІ АБУТКУ НА ПАЎМІЛЬЯРДА

У Віцебску супрацоўнікі падатковай у краме прыватнага прадпрыемства ўстанавілі факт рэалізацыі адзення і абутку (каля 1,4 тысячы адзінак на суму 509 мільёнаў) без наяўнасці дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё і водпуск тавараў для рэалізацыі. Таксама ўстаноўлена парушэнне парадку маркіроўкі кантрольнымі знакамі больш як 608 пар абутку на суму 323 мільёны рублёў. Тавар арыштаваны і канфіскаваны.

— За гэта прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — штраф, памер якога можа скласці да пяцідзесяці базавых велічынь з канфіскацыяй тавараў, выручкі, — паведамілі ў падатковым ведамстве. І ў Полацку пры праверцы крамы прыватнага прадпрыемства была выяўлена рэалізацыя абутку, сумак агульным коштам 213 мільёнаў рублёў без дакументаў... А яшчэ 841 пара на суму 210 мільёнаў рублёў прадавалі без наяўнасці кантрольных знакаў. Выявілі і яшчэ адно парушэнне: у краме няма плацежнага тэрмінала для прыёму пластыкавых банкаўскіх картак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАНЬЯК НА 100 МЛН

У сталіцы выяўлена буйная партыя каньячнага спірту.

Спачатку супрацоўнікі падраздзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС і Цэнтральнага РУУС разам з падатковымі інспектарамі знайшлі спіртазмяшчальную вадкасць у гаражна-будаўнічым кааператыве ў Фрунзенскім раёне. Каньячны спірт быў у 5-літровых каністрах, якіх аператыўнікі налічылі ажно 581. Ёмістасці не былі прамаркіраваны адпаведным чынам. Высветлілася, што груз паступіў у Мінск з тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, а ў таварасуправаджальных дакументах ён быў пазначаны як «Аўтахімія». Падчас далейшых праверачных мерапрыемстваў аператыўнікі выйшлі на яшчэ адну частку гэтай жа партыі. На гэты раз у гаражы гаражна-будаўнічага кааператыва, размешчанага ў мікрараёне Серабранка, было знойдзена яшчэ 625 літраў аналагічнай спіртазмяшчальнай вадкасці. Уся партыя на агульную суму больш за 100 мільёнаў рублёў канфіскавана. У дачыненні да асоб, якія арганізавалі нелегальную пастаўку каньячнага спірту ў Мінск, праводзіцца праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НЕЛЕГАЛЬНЫ ТАКСІСТ «ЗГУБІЎ» КОЛЫ

Даволі працяглы час адзін жыхар Чавусаў у якасці «бамбілы» зарабляў нядрэнныя грошы. Тое, што аб гэтым добра вядома кампетэнтным органам, мужчыну моцна не турбавала. Раней ён неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю без дзяржаўнай рэгістрацыі.

Аднак у жніўні мясцовыя падатковыя інспектары «злавілі» яго непасрэдна пры аказанні паслуг таксі без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. На «шэрага» таксіста склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, а аўтамабіль «Форд Гэлаксі» коштам 77,9 млн рублёў арыштавалі, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе МПЗ. Потым гаспадарчы суд Магілёўскай вобласці аштрафаваў эканамічнага «рэцыдывіста» на 3 млн рублёў з канфіскацыяй аўтамабіля ў даход дзяржавы.

Сяргей КУРКАЧ.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту па абароне дзяржаўных сакрэтаў Аддзела дакументаабароту, кантролю і абароны дзяржаўных сакрэтаў Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Сабяшчук Ірыне Аркадзьеўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

Калектыў Мінскага гарадскога цэнтра нерухомасці выказвае шчырыя спачуванні вядучаму спецыялісту сектара па забеспячэнні эфектыўнасці выкарыстання нерухомай маёмасці Бандарэнцы Алене Дзмітрыеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю МУЖА.

УКРАЛІ $18 МЛН З ДАПАМОГАЙ ФАЛЬШЫВАГА АНТЫВІРУСА

Ахвярамі злачыннай групы пад кіраўніцтвам беларуса сталі больш за 200 тыс. грамадзян са 125 краін

Беларус стварыў вэб-сайт міжнароднага ўзроўню — своеасаблівую крымінальную сацыяльную сетку. З дапамогай апошняй аб'яднаў больш за 100 грамадзян розных дзяржаў, якія валодаюць навыкамі здзяйснення злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій. Кожны з «кардараў» спецыялізаваўся на выкананні пэўнай ролі ў працэсе падрыхтоўкі і здзяйснення крадзяжоў.

— Злачынная група з выкарыстаннем разгалінаванай сістэмы вэб-сервераў распаўсюджвала ў інтэрнэце праграму — так званы фальшывы антывірус, — патлумачыў **следчы па асабліва важных справах упраўлення па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і інтэлектуальнай уласнасці галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта Беларусі Іван СУДНІКОВІЧ.** — Праграма цалкам імітавала працу антывіруснага праграмнага забеспячэння, але пры гэтым паказвала лжывыя паведамленні аб заражэнні камп'ютара шматлікімі вірусамі, якіх на самой справе не было, і прапаноўвала набыць поўную версію, каб абараніць камп'ютар. Напалоханыя карыстальнікі камп'ютараў пакідалі на спецыяльных сайтах зламыснікаў рэквізіты сваіх плацежных карт. Наіўна меркавалі, што такім чынам купляюць легальнае антывіруснае праграмнае забеспячэнне ў надзейнага вытворцы.

Такім чынам, за чатыры месяцы арганізаваная злачынная група здзейсніла больш за 260 тыс. эпізодаў крадзяжоў з карт-рахункаў на суму звыш $18 млн. Пацярпелымі ад злачыннай дзейнасці сталі больш за 200 тыс. грамадзян, якія пражываюць у 125 дзяржавах.

— Асноўныя сродкі атрымліваў непасрэдна кіраўнік злачыннай групы, які затым размяркоўваў іх паміж усімі ўдзельнікамі, — адзначыў Іван Судніковіч. — Яго затрымалі ў Кіеве. У яго гаражы знаходзілася пяць дарагіх аўтамабіляў. Кошт кожнага складае ад $100 тыс. Маёмасць канфіскавана. Астатнія ўдзельнікі групы атрымлівалі грошы ў залежнасці ад сваёй ролі. Выплаты некаторым з іх дасягалі $600 тыс.

Акрамя кіраўніка, затрыманы і знаходзяцца пад вартай яшчэ тры актыўныя ўдзельнікі арганізаванай злачыннай групы — усе грамадзяне Беларусі. Іх сярэдні ўзрост — 25 гадоў. Маладым людзям пагражае зняволенне тэрмінам да 15 гадоў.

Надзея ДРЫЛА.

Даведка «Звязды»

Следчы камітэт Беларусі атрымаў сертыфікат і ўзнагароду ад кампаніі Visa за ўклад у барацьбу з кіберзлачыннасцю.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ЧАМУ «ПАЦЯЖЭЛІ» ГАЗАВЫЯ БАЛОНЫ?

З пасёлка Бобр Крупскага раёна патэлефанаваў з пытаннем Міхаіл Уладзіміравіч Карнейка. Датычылася яно звадкаванага газу ў балонах для насельніцтва, дакладней, кошту на яго.

— Вось прачытаў днямі ў вашай газеце, што цана на звадкаваны прыродны газ для насельніцтва павялічылася на 4 працэнты. Але гаворка ішла пра «блакітнае паліва», якое рэалізуецца ў малалітражных балонах аб'ёмам 1-27 літраў. У той жа час было пазначана, што цана на газ у балонах аб'ёмам 50 літраў застаецца ранейшай. Дык вось, я нядаўна замовіў сабе такі балон, і мне яго прывезлі па цане 56 700 рублёў. Прыкладна месяц таму я плаціў за аналагічны балон толькі 48 100 рублёў. Як гэта разумець? — пытаўся наш заяўнік.

У Крупскім цэху звадкаванага і прыроднага газа (гаргазе) нам патлумачылі, што атрымалі афіцыйны ліст ад «Мінаблгаза», дзе ўказаны новыя цэны на прыродны звадкаваны газ. У прыватнасці, цяпер за адзін кілаграм газу спажыўцы павінны плаціць 2,7 тысячы рублёў. За 50-літровы па аб'ёме балон выходзіць якраз названыя 56,7 тысячы рублёў. «Гэты ліст мы атрымалі 2 кастрычніка і з сённяшняга дня пачалі развозіць балоны па новай цане», паведамілі «Звяздзе» на прадпрыемстве.

Канчаткова кропкі над «і» расставілі ў «Мінаблгазе». Сапраўды, згаданае чытачом павялічэнне з пачатку месяца цаны звадкаванага прыроднага газу на 4 працэнты закранула малалітражныя балоны аб'ёмам 1-27 літры. Такое рашэнне, нагадаем, змяшчалася ў пастанове Міністэрства эканомікі. Цэны на газ у балонах аб'ёмам 50 літраў дакумент не закранаў, таму што яны міністэрствам... не рэгулююцца.

У «Мінаблгазе» далей паведамілі, што пастановай Савета Міністраў ад 27 верасня 2013 года № 849 былі ўнесены змяненні ў пастанову Савета Міністраў ад 4 лютага 2011 года № 138, згодна з якімі і павысіліся цэны на звадкаваны прыродны газ у балонах аб'ёмам 50 літраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 38 (208)

■ Пра «ТэАрт»

Сцэнічныя феноМЕНЫ

Фактычна прарыў: на айчыннай сцэне адразу чатыры новыя спектаклі, аўтары якіх — нашы сучасныя драматургі. Плюс яшчэ адзін — пластычны. Ушчыпніце мяне!.. Гэта не сон, а ява, хоць месцамі яна была амаль падобная на сон — паводле трактоўкі пастаноўшчыкаў. Але сутнасць не ў гэтым, а ў тым, у што мы самі доўга не верылі (звычайная беларуская практыка), пакуль не паказалі іншыя: у Беларусі раптам з'явіліся актуальныя п'есы, якія можна і трэба ставіць. Толькі вось апошняе — ставіць — тычыцца ўжо не Беларусі, а краін суседніх. Неяк дзіўна, але факт: беларускі тэатр застаецца больш грувасткім і традыцыйным як з пункту гледжання рэжысёрскага, так і аўтарскага. Слова «аўтарскі» наўмысна стаўлю другім, таму што яны, аўтары, якраз залежаць ад жадання рэжысёраў іх ставіць. А ў рэжысёраў гэтае жаданне ў большай ступені прадыктавана кантэкстам, дзе магчымыя ці немагчымыя эксперыменты. Дык вось, фестываль на тое і патрэбен, каб часам рабіць немагчымае магчымым. Напрыклад, паказаць дакументальны тэатр праз пастаноўку ў Новым драматычным тэатры «PATRIS» (пра яе будзе асобная гаворка ад Таццяны Арловай). Але хацелася б спыніцца на іншых спектаклях, каб назваць імёны і паказаць сутнасць эксперымента рэжысёрскага, глебу для якога ствараюць драматургі.

Зімовая феерыя пасля спектакля паводле Паўла ПРАЖКО.

СЦЕШЫК

Канстанцін Сцешык — аўтар п'есы «Кароткачасовая», якая прыцягнула ўвагу расійскага рэжысёра Сямёна Александроўскага. Тэатральны форум даў яму магчымасць праэксперыментаваць. Ён гэта зрабіў. П'еса пра кароткачасовую чалавечую памяць, у якой ідзе дыялог бацькі з сынам, дэманстравалася ў выглядзе… цітраў на сцяне. Іх прачыталі. Сутнасць зразумелі. Далей — пачалася дэманстрацыя таго, што, на думку рэжысёра, уяўляе сабой кароткачасовасць. На сцэне пасярод расстаўленай старой мэблі ляжалі навушнікі, да якіх пачалі выходзіць людзі з залы і нешта ў іх слухаць. Па меры таго, як залу запаўняла цішыня, усё больш і больш з'яўлялася жаданне ў гледачоў узнімацца на сцэну. У навушніках гучала тая ж п'еса, якую чыталі па ролях розныя людзі — часам бацька з сынам, часам іншыя, нават сам рэжысёр… Гледачы мяняліся навушнікамі, каб паслухаць розных выканаўцаў, калі іх можна так назваць. Пераходзілі з канапы на крэсла і гэтак далей. У нейкі момант мэблю сталі прымаць — выносіць літаральна з-пад тых, хто быў на сцэне. Даводзілася ісці зноў у глядзельную залу, назіраючы за тым, як рэчаіснасць імгненна мянялася, а сцэна пусцела. Кароткачасовасць уласцівая не толькі памяці. Яна, бывае, уласцівая пачуццям, яна ўласцівая самому жыццю. І ў гэтым жыцці нейкімі фрагментамі з'яўляюцца іншыя людзі. Кароткачасовыя з'яўленні… Каб потым і яны — людзі з іх праблемамі, жаданнямі і чаканнямі — сышлі ў цемру забыцця…

Метафарычна і цікава. Інтэрактыўна. Так падавалася. Але не ўсе былі гатовыя да такога радыкальнага эксперымента: фактычна да маўклівай дэманстрацыі драматургіі.

ПРАЖКО

І, можа быць, пытанні да эксперымента з «Кароткачасовай» засталіся б, каб не было іншых — з п'есай Паўла Пражко «Засмучаны хакеіст».

У былым павільёне завода (клуб «Ме100») размясціліся дзве дзіўныя глядзельныя пляцоўкі, падзеленыя белымі аркушамі паперы, паводле задумы рэжысёра Дзмітрыя Валкаст-рэлава. Гэта той самы рэжысёр, які ў Санкт-Пецярбургу вельмі актыўна ставіць п'есы беларускага драматурга Пражко. І вось — Мінск. І трэба радавацца: такі рэжысёр ды ў нас нешта зрабіў! Але пасля — больш пытанняў: а што ж зрабіў? Што гэта было?

Павел Пражко прыдумаў героя — Ігара, натуру паэтычную, нават узнёслую. Мы адразу, дзякуючы дзяўчыне, што чытае вершы, уваходзім у свет гэтага чалавека з вельмі пяшчотнай душой: гэта яго вершы. Месцамі — аматарскія, месцамі — лірыка, месцамі — графаманства. Ці штосьці падобнае на нейкія дзённікавыя запісы (чаго варта толькі адна заўвага: калі іншыя мужчыны называлі жонку «яна», то ён заўсёды — Ірынка…). Хочацца рыдаць ад шчырасці!.. І вось наступная частка жыцця Ігара неяк не стасуецца з яго душэўнай часткай: ён — мужны мужчына, які гуляе ў хакей. Але яго самога ў глядзельным павільёне мы бачым толькі ў відэа, якое дэманструецца на белым экране. Ігар вырашыў зрабіць сваім калегам па камандзе прыемнае: упрыгожыў распранальню выразанымі з паперы белымі сняжынкамі. Вось такі ўчынак для сапраўднага мужчыны.

Стала магчыма гаварыць пра феномен «новай хвалі» беларускай драматургіі.

Але неяк не стасавалася першае з другім. Дзве часткі жыцця Ігара так і засталіся часткамі: вершы прагучалі, відэа паглядзелі (трэба сказаць, трошкі зацягнутае). Але чаму тады трэба было разбіваць прастору на два павільёны, калі з гэтым рэжысёр ніяк не пагуляў? Было б зразумела, калі б у адным перад гледачамі разгортвалася паэтычнае жыццё, а ў другім — хакейнае. Але канцэпцыя не пайшла далей за тое, каб галасы ў адным і другім павільёне даганялі адзін другога. Самым прыемным эпізодам гэтага спектаклю быў выхад з павільёнаў, дзе чакаў прыемны сюрпрыз — развешаныя папяровыя сняжынкі…

Але гэта хутчэй эксклюзіў ад Пражко (амаль гламурны) — адмыслова для Беларусі. Ну «не зайшлі» тут асабліва яго ранейшыя п'есы, дзе гучала руская ненарматыўная лексіка…

БАГАСЛАЎСКІ

Чаму прыходзяць у снах нябожчыкі? Што яны хочуць паведаміць? Пра што папярэдзіць? Аднойчы здаецца, што дзеля таго, каб высветліць нейкія пытанні, на якія раней не знайшлося адказаў: «Тата, а ты мяне любіў?..» Але і ў снах адказ адразу не даецца. Да яго трэба дайсці. Саспець. Быць гатовым. Герой п'есы Дзмітрыя Багаслаўскага «Ціхі шоргат сыходзячых крокаў» пакутуе ад сваіх сноў, у якіх размаўляе з памерлым бацькам. Едзе жыць у яго хату — каб зразумець нешта важнае для сябе. Пачуць ад яго параду, як пачысціць калодзеж, і просьбу прыбраць куст з матчынай магілы, бо душыць яе… Разабрацца з сёстрамі, якія хочуць прадаць хату, — каб яму пакінулі. І ўсё-такі зразумець сэнс гэтых пякучых сноў — у экстрасенса (псіхолага). Але зноў ад іх пакутаваць, сустракацца са сваякамі ды суседам, які ведаў бацьку, каб задаць усё тое ж пытанне…

І зноў пачаць трызніць… Зноў чысціць калодзеж і прыбіраць куст, з кожным разам набліжаючы чарговую сустрэчу з бацькам. Высыпаецца пясок (ён сімвалізуе ваду) — як ідзе час галоўнага героя. І з кожным разам усё больш цісне гэтае пытанне. З кожным разам гук свістулек, з якімі гулялі ў дзяцінстве, становіцца пранізлівейшым: усе выраслі, у кожнага з дзяцей сваё жыццё, усім патрэбны грошы, і толькі Аляксандру — бацькава хата.

П'еса ідзе нібыта кругамі. Кожны новы віток — новы сэнс, новы пласт, за якім набліжаецца адказ. Артысты Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі спрабавалі выцягнуць напружанне ігрой. На жаль, праца рэжысёра Шаміля Дыйканбаева (запрошаны з Кыргызстана) не дазволіла адчуць шматузроўневасць драматургічнага матэрыялу. Асобныя моманты метафар не выратоўвалі сітуацыю: розныя ўзроўні засталіся не акрэсленымі рэжысурай. А шкада: глыбокі і вельмі чалавечы матэрыял звяртае да таго, што тычыцца і турбуе кожнага: да шчырасці, любові, такіх рэдкіх цяпер нават сярод блізкіх людзей. Аляксандр адказ знаходзіць. І разумее, чаму ж да яго ў сны так настойліва прыходзіў бацька… А за ім і глядач — таму што сюжэт і сэнс п'есы Дзмітрыя Багаслаўскага зразумелы з таго, што прамаўляюць артысты, а не з таго, як гэта пададзена на сцэне. Так, мінімалізм, так, адчуванне цякучасці часу, зменлівасці (праз пясок) ёсць. Але гэта такая дробязь у параўнанні з тым, пра што п'еса. Дзіўна тое, што яе аўтар — зусім малады чалавек. А такое адчуванне, што пражыў сто гадоў… Калі глыбіня ёсць, то яна ёсць, нягледзячы на несупадзенне з глыбінёй рэжысуры. І гэта вырасла і выхавалася ў нас!

ІНАЗЕМЦАЎ

Што ёсць «мы»? З чаго яно ствараецца? І дзе вырастае? Насуперак чаму? Такія пытанні задаваў сабе — і беларускім гледачам — Вячаслаў Іназемцаў, аўтар спектакля «Рамонт», прэм'еру якога прадставіў пластычны тэатр «Інжэст».

Нам фактычна распавялі гісторыю нашай краіны. Прыгожай, як ранішняе світанне над воднай паверхняй. Спеўнай, як птушыны гай. Рамантычнай, як пацалункі закаханых пры зіхатлівым агеньчыку. Такой прывабнай, але трошкі, можа, архаічнай. Чаму б не зрабіць у ёй якую рэканструкцыю? Ёсць жа спецыялісты! Ёсць землямеры, якія час ад часу прыглядаюцца да абсягаў, але вось жа няўдача: нязручна хадзіць — зацягвае…

Зацягвае, уцягвае, прыцягвае. Уцягвае і гэтае дзеянне, вельмі нетаропкае, нават трошкі манатоннае, але такое падобнае на рытм нашага жыцця. І з гэтым прыходзіцца лічыцца, сачыць за персанажамі, якія выпаўзаюць… з глядзельнай залы. Дзеянне разгортваецца літаральна наадварот: гледачы занялі месцы, згодна з квіткамі, на сцэне. І адтуль, са сцэны, назіралі за тым, што робяць артысты, якія ходзяць, лазяць, поўзаюць па крэслах, правальваюцца, зноў устаюць, каб паказаць, як можа аднаўляцца жыццё ў асобна ўзятай купіне пасярод багны, якія каларытныя ў ёй ёсць персанажы, як у іх адбываюцца святы і вяселлі, як плённа працуецца.

Але не пакідала адчуванне таго, што галоўныя ўдзельнікі гэтага спектакля размясціліся менавіта там, дзе сцэна. І назіралі адтуль за тым, якая іх уласная рэчаіснасць. Гэта спектакль, дзе ў кожнага — і з артыстаў, і з гледачоў — свая роля. Нездарма ў фінале жыхары гэтай містэрычнай краіны паўзуць да сцэны з кветкамі — і дзячаць тым, хто глядзеў перформанс, які ёсць у жыцці. Але што гэта было: эксперымент альбо частка сапраўднага жыцця, у якім, дарэчы, ёсць месца і артыстам, і культурным установам, якія перыядычна перажываюць рамонт?..

Заслона. Музыка. Апладысменты. Каму?..

Тым, хто робіць у нас тэатр як мастацтва, не звяртаючы ўвагу на густ масавай аўдыторыі. І аўдыторыі — за тое, што дае тэмы для асэнсавання.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Чым прываблівае маладая беларуская драматургія расіян?

Пра гэта гаварылі крытыкі і эксперты тэатра з Расіі, якія наведалі Мінскі форум

Дзмітрый РЭНАНСКІ, тэатравед, начальнік аддзела па сувязях з грамадскасцю Тэатральна-культурнага комплекса «Александрынскі»:

— За апошняе дзесяцігоддзе адбылася неверагодная экспансія беларускай драматургіі на расійскую сцэну — калі на шэрагу драматургічных конкурсаў у Расіі з'явілася некалькі новых для расійскай драматургічнай прасторы імён (Павел Пражко, Андрэй Курэйчык, Канстанцін Сцешык). Паколькі гэтая плеяда з'явілася ў адзін момант і вельмі яркая, то стала магчыма гаварыць пра феномен «новай хвалі» беларускай драматургіі. Таму што беларуская драматургічная школа была заўсёды моцная ў савецкай культурнай прасторы. Але плеяда, якая выступіла ў 2000-я гады, не мела нічога агульнага з тымі драматургамі, якія працавалі яшчэ ў савецкі час. «Новая драма» ператварылася са з'явы маргінальнай фактычна ў мэйнстрым. Пры гэтым у беларускай тэатральнай прасторы іх фактычна няма, за выключэннем гераічных высілкаў, якія робяць энтузіясты ў Мінску, нейкіх абласных гарадах, дзе з'яўляюцца адзінкавыя пастаноўкі п'ес Пражко, Сцешыка, Багаслаўскага. Але гэта непараўнальна з Расіяй.

Алена КАВАЛЬСКАЯ, тэатравед, старшыня экспертнай рады Нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска»:

— 7 гадоў я займалася фестывалем «Любімаўка», дзе мы праводзілі конкурс, на які маладыя людзі дасылалі п'есы, напісаныя на рускай мове. П'есы Косці Сцешыка, Паўла Пражко і Дзмітрыя Багаслаўскага заўсёды выпадалі з трэндаў, за іх чаплялася вока. На прасторы рускай мовы маладыя людзі пісалі п'есы, якія не ўкладваліся ў афіцыйнае мастацтва. Мы шукалі арыгінальныя рэчы, і яны заўсёды знаходзіліся ў Беларусі…

Вольга ШАКІНА, тэатральны крытык, аўтар газеты «Ведомости» і часопіса «Афиша»:

— У мяне пачалося знаёмства з беларускай драматургіяй дзякуючы Паўлу Пражко. Але потым я ўбачыла абсалютна іншага аўтара — Канстанціна Сцешыка, які іграе са словам. А потым з'явіўся сапраўды магічны рэаліст (з чым у нас вялікія праблемы, гэты вопыт страчаны) — Багаслаўскі. І ён таксама аказаўся з Мінска. Менавіта тут «узышлі» тры самыя цікавыя драматургі для мяне за апошнія 10 гадоў.

Для мяне з плыні «Новая драма» вылучаецца Пражко. Я б сказала, што гэта новая эстэтыка… Для яго няма погляду: ні знутры, ні звонку. Няма іерархіі. Пражко ёсць аўтар, але ён ніводнага разу не зліваецца ні з самім сабой, ні з ландшафтам, ні са сваім персанажам. А пры гэтым ён і ёсць — яны… Калі я пачала чытаць тэксты Пражко, я зразумела, што яны звязаны з перажываннем памяці і дэжавю, магчымасцю атрымаць дыялог з іншымі прасторамі і сусветамі, і ты не разумееш, у якіх сувязях ты ў гэты момант знаходзішся.

Запісала Ларыса ЦІМОШЫК

■ Нотны радок

САЛІСТЫ З МАСКВЫ

Народны артыст Расіі прыязджаў у Мінск пачытаць «Воблака ў штанах» Маякоўскага — у канцэрце камернага ансамбля «Салісты Масквы» пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета, які з 2006 года кожную восень праводзіць у Беларусі фестываль свайго імя.

— Акцёрская прафесія адрэналінавая. Любыя эксперыменты мне як творчаму чалавеку дадаюць адрэналіну. Падобныя эксперыменты з аркестрам адбываюцца дастаткова рэдка. А гэта эксперымент, якім хацелася парадаваць гледача: дарэвалюцыйная паэзія, заснаваная на асабістых перажываннях, гучыць цяпер з музыкай, — сказаў Канстанцін Хабенскі. — Гісторыя паказвае, што многія паэты і пісьменнікі, апісваючы свае душэўныя пакуты, гаварылі шмат таго, што кладзецца на настрой, на сітуацыю. Гэта мне здаецца вельмі актуальным па душэўным настрої. Нам трэба было сумясціць двух няпростых творцаў у адным канцэрце. Такога мы яшчэ не рабілі нідзе. Я з задавальненнем прыехаў у Мінск, тым больш што апошні раз я тут быў гадоў 15 таму назад.

Натуральна, што двум вельмі занятым майстрам мець рэпетыцыі напярэдадні такога канцэрта было складана, таму дапамаглі сучасныя тэхналогіі: можна не збірацца ў адным памяшканні, але абмеркаваць, як строіць праграму.

Фота БЕЛТА.

Музыка была падмацавана выставай беларускіх мастакоў з калекцыі кампаніі «Зубр капітал». Як адзначыла прадстаўнік кампаніі Антаніна Сярабракова, Віцебская школа — гэта брэнд, вядомы далёка за межамі нашай краіны.

— Звярніце ўвагу на колькасць беларускіх выканаўцаў, асабліва маладых, якія сёлета прымаюць удзел у фестывалі Юрыя Башмета, напрыклад, аркестр пад кіраўніцтвам Уладзіміра Перліна, які карыстаецца поспехам за межамі Беларусі, — кажа мастацкі кіраўнік фестывалю Расціслаў Крымер. — Спецыяльна замоўлены твор беларускаму кампазітару: «Архітэктон» Валерыя Воранава напісаны для чатырох піяністаў.

Фестываль Юрыя Башмета на думку Крымера, карыстаецца невялікай колькасцю бюджэтных сродкаў. Намеснік міністра культуры Уладзімір Карачэўскі адзначыў:

— Гэта прыклад дзяржаўнага і прыватнага партнёрства. Дзякуючы актыўнай падтрымцы спонсараў, партнёраў, пры невялікім фінансаванні з бюджэту могуць праходзіць буйныя фестывалі з удзелам зорак сусветнай музыкі.

Адна з такіх зорак — сучасны польскі кампазітар Кшыштаф Пендэрэцкі, адзін з прадстаўнікоў музычнага авангардызму. Прэм'еры яго твораў у свеце становяцца падзеямі, а ён сам — чаканы госць у любой краіне. Учора на сцэне філармоніі легенда сучаснай музыкі (якому ўжо 80 гадоў) выступаў як дырыжор.

З асабліва чаканых зорак сёлета ў фестывалі бярэ ўдзел вядомы ў свеце скрыпач Максім Венгераў, якога дагэтуль у Мінску не слухалі. Іграць музыкант будзе на скрыпцы Страдывары, смычком славутага музыканта Яшы Хейфіца. Але гэты канцэрт будзе на заканчэнне — 12 кастрычніка.

Фестывальныя канцэрты сёлета можна будзе паглядзець на тэлеканале «Беларусь-3».

Ларыса ЦІМОШЫК

Акцёр Павел ХАРЛАНЧУК:

«ТРЭБА ШУКАЦЬ СВОЙ АДМЕТНЫ ТВАР»

■ Асобы

Акцёр Купалаўскага тэатра Павел Харланчук — адзін з самых прыкметных акцёраў свайго часу. Яго твар пазнавальны і ў пэўным сэнсе сведчыць пра знак якасці таго, у чым Павел бярэ ўдзел. Акрамя тэатра ён актыўна здымаецца ў кіно і тэлесерыялах (расіянам ён добра вядомы), працуе вядоўцам розных культурных імпрэз. Днямі скончыліся здымкі фільма паводле сцэнарыя Аляксея Дударава «Белыя росы-2» (рэж. Аляксандра Бутар), у якім Харланчук іграе адну з галоўных роляў. А неўзабаве ў Купалаўскім пачнуцца рэпетыцыі амбіцыйнага «Пана Тадэвуша», у якім Павел таксама задзейнічаны.
А пакуль карэспандэнтка «Звязды» на здымачнай пляцоўцы паспела паразмаўляць з акцёрам пра складаны выбар паміж тэатрам і кіно, пра тое, як выжыць на маленькі заробак і выхоўваць дзяцей (якіх у Паўла чацвёра!) па-беларуску.

Пра гераяў і дзяцей

— Ваш герой у «Белых росах-2» у пэўным сэнсе — беларус нашага часу. Які шлях ён праходзіць, перш чым стаць самім сабой?

— Мой герой — Арцём Бародзіч (дарэчы, ёсць у мяне сябар з абсалютна такім жа імем і прозвішчам — таксама акцёр Купалаўскага тэатра). Скарочана майго персанажа ўсе завуць Бодзя. Ён не буйны бізнесмен, але ён вельмі хоча ім быць, таму што час такі, трэба мець фінансавую незалежнасць. Яму здаецца, што так ён стане асобай. У яго ёсць сябар па мянушцы Рус — Русачэнка (іграе Сяргей Жбанкоў). Яны ўдваіх працавалі ў фірме. Але фірма не была вельмі паспяховай. Раптам да іх паступае прапанова ад замежных інвестараў: калі знойдуць месца для будоўлі турыстычнага цэнтра, то добра заробяць. Яны бяруцца за гэтую справу. Але ім замінаюць жыхары месца, якое выбралі інвестары. Там літаральна тры хаты засталося. Але людзей трэба пераканаць, што яны павінны з'ехаць… Карацей, Бодзя спрабуе рабіць тое, да чаго не ляжыць яго душа, спрабуе перамагчы сябе і ісці туды, куды не трэба ісці. Гэта не ягонае, і ён гэта разумее толькі ў канцы. І такая трансфармацыя з ім адбываецца: напачатку жорсткі і беспрынцыповы, у канцы ён становіцца звычайным нармальным хлопцам. І я думаю, што ў яго нармальная светлая будучыня. Таму што «Белыя росы-2» — гэта не чорны фільм. Я люблю такія добрыя перамены ў людзях. Для нейкіх сучасных мастакоў гэта, магчыма, здаецца банальным. Яны, магчыма, думаюць, што трэба шукаць нечага іншага, негатыву. А мне гэтага не хочацца. Мне заўсёды хочацца верыць, што напарадзе сапраўды ёсць нешта светлае.

Бухгалтары скажуць, што гэта нявыгадна, што рынку збыту не будзе. Яны скажуць, што нам трэба здымаць на Расію па такіх і гэткіх прычынах. Але пакуль мы гэтага шляху не пройдзем, мы не зразумеем, што сапраўды наша.

— Ці ёсць у вас улюбёныя ролі?

— Ну, я іх усе люблю! Тыя, якія я цяпер іграю, яны проста ёсць. Можа быць, ёсць нейкая настальгія па ролях, якія ўжо адыграў. Па Жаданаму з «Даходнага месца», якога я іграў яшчэ ў Горкаўскім. Тое, што мы маем — гэта адно. А па тым, чаго ўжо няма, заўжды сумуеш, узгадваеш. Не ведаю, ці хацеў бы я зноў іграць Жадава, але шкада, што гэтая роля адышла, што, можа, недасканала сыграў…

— Якіх гістарычных альбо літаратурных персанажаў вы б хацелі сыграць на сцэне альбо ў кіно?

— Я так не задумваўся ніколі. Пакуль справіцца б з тым, што даюць. А так, каб марыць пра нейкага персанажа… Заўжды мяне неяк прывабліваў шэкспіраўскі тата Джульеты. І такі маналог у яго ёсць пранікнёны. Мне хочацца іграць тату. Адназначна.

— А вашы ўласныя дзеці вас часта бачаць? У вас такі шчыльны графік. Калі вы паспяваеце іх выхоўваць?

— Ну, цяпер складаны час, яны бачаць мяне меней. Але мы паспелі адпачыць разам. А наконт беларушчыны… Гэта ж не мы прыдумалі: калі няма мовы, тады няма народа. А мне так не хочацца, каб наш народ знік. Таму мае дзеці дома размаўляюць па-беларуску. Хаця мая жонка Ганна, дарэчы, нарадзілася ў Расіі, у Мурманску. Але жыве тут і таксама размаўляе па-беларуску. Я ёй, праўда, таксама кажу, каб сваё не забывала. Але ў Беларусі шмат прыкладаў, калі людзі, якія прыязджалі з іншых краін, рабілі для нашай краіны, можа, нават больш, чым самі беларусы. Хаця б Наталлю Арсеневу прыгадаць альбо Уладзіміра Мулявіна. Самае галоўнае, што ў маіх дзяцей сям'я асацыюецца з беларускай мовай. Зразумела, што яны з дзецьмі на вуліцы размаўляюць па-руску. Асяродак такі. У школу (у трэці клас) у нас ходзіць толькі сын Піліп. Ён навучаецца па індывідуальным плане, прыпісаны да беларускамоўнай школы ў Пятрышках, таму што мы жывём у Мінскім раёне. Але навучаецца ён дома з мамай, яна яго першая настаўніца. Прадметы ўсе па-беларуску: «Чалавек і свет» ды іншыя. А ў Пятрышкаўскую школу ён ездзіць, каб здаваць іспыты. Дарэчы, найлепшы вучань у класе. Яшчэ паспявае хадзіць у басейн, вучыцца іграць на гітары.

Фота Надзеі БУЖАН.

Пра заробак у тэатры і кіно

— У тэатральных акцёраў вельмі невялікія заробкі, а сям'ю трэба ўтрымліваць. Вунь, нядаўна Святлана Зелянкоўская гаварыла пра гэта…

— Што тут гаварыць… Зразумела, што гэта ганебна. Відавочна, што заробкі ў тэатры проста несуадносна меней, чым заробкі ў кіно. І не заўсёды ў кіно такая праца, як у тэатры. Таму, калі б, не дай Бог, паўстала пытанне выбару паміж тэатрам і кіно, то я выбраў бы кіно. І не таму, што кіно лепей, а таму што трэба проста існаваць, утрымліваць сям'ю, чацвёра дзяцей. Да таго ж у кіно сёння таксама нешта адбываецца. У нас жа быў крыху заняпад, наогул крызіс у краіне. Цяпер, праўда, нельга сказаць, што беларускае кіно сусветнага ўзроўню, але нейкі рух наперад ёсць. Мне так здаецца. Крыху нешта варушыцца. І мы бяром у гэтым нейкі ўдзел, і спадзяюся, што гэта дасць плён.

— Вы адзін з самых запатрабаваных і вядомых беларускіх акцёраў. Ці не цяжка пераходзіць ад тэатра і вялікага кіно да серыяльнага фармату?

— Ёсць рэчы, дзе я зарабляю, а ёсць рэчы, дзе я працую. Ёсць для душы, а ёсць для існавання. Зразумела, што сёння, дзякуй Богу, усё менш і менш з'яўляецца прапаноў, дзе трэба проста «адбыць свой нумар». У мяне цяпер вельмі шмат цікавых прапаноў, разнастайных. Героі і такія, і гэткія: і станоўчыя, і адмоўныя, і гідкія; і казкі, і камедыі, і меладрамы. Думаю, калі праца ёсць, дык трэба працаваць. Калісьці я ўжо казаў: пакуль ёсць магчымасць рабіць тут, у Беларусі, дык трэба рабіць тут. Ну, бывае часам, што стаміўся… Вось скончыліся здымкі «Белых росаў», і я буду цалкам аддаваць сябе тэатру. Там Мікалай Пінігін плануе ставіць спектакль «Пан Тадэвуш» па Адаму Міцкевічу. Ну, і далей нейкія планы. Ужо здымкаў не будзе. Ёсць акцёры, якія толькі здымаюцца, ёсць — якія толькі ў тэатры працуюць. Я і там, і там спрабую. Пакуль у мяне гэта збольшага атрымліваецца. Буду працягваць.

Пра нацыянальнае кіно, заняпад і крызіс

— Што павінна адбыцца, каб пра беларускае кіно загаварылі, каб нацыянальная кінашкола з'явілася, стыль, адметнасць?

— Ведаеце, чаго б я хацеў і што, мне здаецца, магло б неяк дапамагчы беларускаму кіно? Я даўно пра гэта казаў і дасюль так думаю. Мы павінны здымаць сваё і, можа, нам трэба яшчэ раз прайсці прайсці гэты шлях, як прайшлі Чэхія, Польшча. Яны экранізавалі ўсю сваю нацыянальную літаратуру. Мне здаецца, што гэта ўсё ж трэба перажыць. Бухгалтары скажуць, што гэта нявыгадна, што рынку збыту не будзе. Яны скажуць, што нам трэба здымаць на Расію па такіх і гэткіх прычынах. Але пакуль мы гэтага шляху не пройдзем, мы не зразумеем, што сапраўды наша. Нам трэба яшчэ раз прайсці гэты шлях, як гэта было на пачатку XX стагоддзя, шукаць менавіта свой, беларускі твар. Мы крыху саромеемся гэтага, нам здаецца, што мы не такія, як усе. Ва ўсіх такая багатая гісторыя, а мы хто такія? З аднаго боку — вялікая Расія, з другога — Амерыка ды Еўропа. А ў нас таксама ёсць сусветна вядомыя мастацкія творы і пісьменнікі. І нам трэба нарэшце зразумець, хто мы ёсць. Таму што мы сёння ў такім становішчы «паміж». Не тыя і не гэтыя…

Я люблю такія добрыя перамены ў людзях. Для нейкіх сучасных мастакоў гэта, магчыма, здаецца банальным. А мне заўсёды хочацца верыць, што напарадзе сапраўды ёсць нешта светлае.

— Па-мойму, у беларусаў гэта спрадвечнае становішча…

— Не, гэта з пэўнага часу мы сталі «тутэйшымі»… Да гэтага ў нас была вельмі буйная і моцная гісторыя, магутная дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае. Ёсць беларусы, якія былі героямі Амерыкі, Чылі. Проста мы не ведаем гэтага: якія жылі людзі, якія мелі маёнткі, якія маршалкі былі, якія прозвішчы; што яны рабілі, якая там дабрачыннасць адбывалася. Генамі мы вельмі моцныя. А ў сучаснасці — кволыя. Вось у гэтым плане ў нас застой. Мы ўсё яшчэ не ведаем, куды нам рухацца. Тут і не да кіно нават! Нам трэба яшчэ раз прайсці ад класікі да сучаснасці ва ўсім. Мне думаецца — гэта правільны шлях.

— Павел, а як па-вашаму зрабіць так, каб беларускі глядач пайшоў глядзець беларускае кіно?

— Ён павінен бачыць у беларускім кіно тое, чаго няма ў замежным. Пакуль мы будзем падрабляцца пад замежныя праекты — «пад Амерыку», «пад Расію» — глядач будзе выбіраць арыгінальнае — тое, з чаго мы капіруем. У нас павінна быць тое, што тычыцца менавіта нашай зямлі, народа, гісторыі. Тыя ж самыя «Апосталы…» Гэта ж беларуская легенда. Тут ужо і амерыканцам, і расіянам самім будзе цікава паглядзець. І беларускім гледачам гэта будзе цікава. Гэта як арыгінальныя беларускія арнаменты, спевы, людзі: толькі нечым аўтэнтычным мы можам быць цікавыя і замежным гледачам таксама. Вось фільм «У тумане» Сяргея Лазніцы паводле Васіля Быкава — гэта падзея. Таму што пра Беларусь, пра нашага пісьменніка загаварылі ў свеце. Вось гэта тое, пра што я кажу — класіка. Трэба шукаць сябе, пакуль ёсць сілы, жаданне. А так мы — як мой персанаж Бодзя: ён думае, што ён такі еўрапейскі бізнесмен, але з-за прагі быць такім ён проста страчвае свой твар. Яму так гэта не пасуе, што яго знутры вываротвае. Ён проста становіцца брыдкім, непрыемным, ён становіцца нікім. Ведаеце, як гавораць: «Свой час не прыходзіць да таго, хто думае, што яго час прыйдзе». Не трэба чакаць, трэба зараз пачынаць.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ХЛЕБ ПАДАРАЖЭЕ НА 10%

Паводле пастановы Мінэканомікі № 70, з 5 кастрычніка прадугледжана павелічэнне на 10% гранічных максімальных адпускных коштаў на хлеб жытні і жытна-пшанічны, булачныя вырабы з пшанічнай мукі з колькасцю па рэцэптуры цукру і тлушчаў у суме не вышэй за 14%.

У дакументе гаворка ідзе аб рэгуляванні цэн вытворцаў на тыя віды хлеба і булачных вырабаў, якія выпякаюцца па простай рэцэптуры без дадатковай сыравіны і залічваюцца да ніжняй цэнавай групы. Згодна з прэйскурантам, адпускныя кошты на «сацыяльныя» хлебныя вырабы ўстанаўліваюцца цяпер у памеры ад 3116 да 6002 рублёў за кілаграм.

Сяргей КУРКАЧ.

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств-членов системы «Зеленая карта» серии BY/01 № 8639229 **считать недействительным.** УНП 101883943.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Минского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инвентарный номер № 600/С-132718, общей площадью 106,5 кв.м, расположено на земельном участке площадью 0,0700 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минская область, Минский район, д. Слобода. Начальная цена с НДС – 40 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (4 000 000 бел. руб.).

Лот № 2: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инвентарный номер № 600/С-139975, общей площадью 95,3 кв.м, расположено на земельном участке площадью 0,1011 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минский район, Роговский с/с, д. Каменец, 8А. Начальная цена с НДС – 330 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (33 000 000 бел. руб.).

Лот № 3: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инвентарный номер № 600/С-139774, общей площадью 57,5 кв.м, расположено на земельном участке площадью 0,0564 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минский район, Папернянский с/с, д. Касынь, ул. Школьная 8А. Начальная цена с НДС – 157 500 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (15 750 000 бел. руб.);

Лот № 4: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инвентарный номер № 600/С-139778, общей площадью 105,8 кв.м, расположено на земельном участке площадью 0,1000 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минский район, Папернянский с/с, д. Пильница, ул. Центральная, 8А. Начальная цена с НДС – 465 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (46 500 000 бел. руб.);

Лот № 5: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инвентарный номер № 600/С-139775, общей площадью 91,4 кв.м, расположено на земельном участке площадью 0,1842 га (предоставлен на праве аренды) по адресу: Минский район, Роговский с/с, д. Ревкутьевичи, 21А. Начальная цена с НДС – 277 500 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (27 750 000 бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.06.2013.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **28.10.2013** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.10.2013** до 12.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	на 01 октября 2013 г.	на 01 октября 2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		175 231,8	141 247,2
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		60 615,0	53 717,0
4	Средства в Национальном банке	1103		159 154,8	210 209,0
5	Средства в банках	1104		383 802,0	277 974,2
6	Ценные бумаги	1105		176 700,9	158 811,3
7	Кредиты клиентам	1106		120 383,1	72 377,8
8	Производные финансовые активы	1107		0,0	0,0
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		15,0	15,0
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		237 773,1	150 428,2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		0,0	0,0
12	Прочие активы	1111		38 995,7	20 947,6
13	ИТОГО активы	11		1 352 671,4	1 085 727,3
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		31 844,9	31 238,6
16	Средства банков	1202		51 475,3	79 840,2
17	Средства клиентов	1203		931 619,4	716 280,8
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		0,0	0,0
19	Производные финансовые обязательства	1205		4 953,9	0,0
20	Прочие обязательства	1206		6 672,3	4 099,2
21	ВСЕГО обязательства	120		1 026 565,8	831 458,8
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		153 800,0	131 826,3
24	Эмиссионный доход	1212		0,0	0,0
25	Резервный фонд	1213		10 588,3	6 595,0
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		125 958,9	96 349,2
27	Накопленная прибыль	1215		35 758,4	19 498,0
28	ВСЕГО капитал	121		326 105,6	254 268,5
29	ИТОГО обязательства и капитал	12		1 352 671,4	1 085 727,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 октября 2013 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.10.2013 г.	01.10.2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		38 172,8	37 471,9
2	Процентные расходы	2012		14 796,6	15 921,7
3	Чистые процентные доходы	201		23 376,2	21 550,2
4	Комиссионные доходы	2021		83 862,6	55 479,4
5	Комиссионные расходы	2022		10 703,2	8 145,0
6	Чистые комиссионные доходы	202		73 159,4	47 334,4
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		13 246,4	4 386,3
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		-2 801,4	-3 007,0
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		54 495,6	46 855,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-3 835,9	-27,1
11	Чистые отчисления в резервы	207		19 742,6	38 076,9
12	Прочие доходы	208		4 809,8	7 418,7
13	Операционные расходы	209		87 683,9	62 120,9
14	Прочие расходы	210		5 480,5	4 081,3
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		49 543,1	20 231,9
16	Налог на прибыль	212		1 515,7	4 666,3
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		48 027,4	15 565,6

Руководитель **Казбанов В.А.**

Главный бухгалтер **Трепашко И.И.**

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г. УНП 807000069.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома

Организатор аукциона	**Лот № 1** — Волковский сельский исполнительный комитет, 211853 Витебская область, Поставский район, д. Волки, ул. Центральная, д. 2А, тел. 8 (02155) 55 9 87. УНП 300085631 **Лот № 2** — Куропольский сельский исполнительный комитет, 211842 Витебская область, Поставский район, аг. Курополье, ул. Октябрьская, д. 27, тел. 8 (02155) 53 1 93. УНП 300085723
Дата, время, место проведения аукциона	**Лот № 1** — 18 октября 2013 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3 этаж, каб. 58) **Лот № 2** — 06 ноября 2013 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3 этаж, каб. 58)
Адрес, площадь, кадастровый номер земельного участка, начальная цена	№ лота 1: д. Кривое-2, ул. Центральная, д. 1 «Б» участок находится в водоохранной зоне водного объекта (озеро Кривое); 0,1570 га; 224080809601000032; 10 000 000 № лота 2: д. Черты, ул. Лесная, д. 40 «Г» участок находится в водоохранной зоне водного объекта (озеро Черты); 0,1552 га; 224082709101000138; 30 000 000
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона	- внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах; - возмещение соответствующему исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; - государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка; - получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации разрешения на строительство жилого дома; - занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации
Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в частную собственность по результатам аукциона	В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращения лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома: г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11
Перечень документов, которые необходимо предоставить участникам до его начала	- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе); - квитанция об уплате задатка; - ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования
Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов	**Лот № 1** — г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 с 07 октября по 17 октября 2013 года. **Лот № 2** — г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 с 07 октября по 01 ноября 2013 года
Сумма подлежащих возмещению организатору расходов на его проведение (уплачивается победителем по соответствующему лоту помимо суммы, заявленной на торгах)	**Лот № 1** — 6 577 140 **Лот № 2** — 5 732 200
Размер задатка, срок и порядок его внесения	10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявлений на счет соответствующего исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявлений на участие в аукционе
Адрес и номер контактного телефона	г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11, в рабочее время с 8.00 до 17.00, тел. 8 (02155) 4 11 32

ОАО «Амкодор-Унимод» 220073, город Минск, ул. Пинская, 18

УНП 100010116

Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 18 октября 2013 г. в 15.00 по адресу: 220073, город Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества.

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.45.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, – 11 октября 2013 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О досрочном прекращении полномочий члена Совета директоров ОАО «Амкодор-Унимод» и избрании члена Совета директоров.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 2 октября 2013 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 11 октября 2013 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод»

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 25 октября 2013 г. проводит повторный открытый аукцион № 10-Сф-13 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. На торги выставляются 14 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске:

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Ангарская, 213 А (Заводской район)	500000000002008103	0,0564	442 985 400	45 000 000	6 530 359
2.	ул. Фучика, 7 (Заводской район)	500000000002007565	0,0574	453 454 720	45 000 000	2 134 249
3.	пер. Грибной, 46/19 (Заводской район)	500000000002008105	0,0477	374 645 700	38 000 000	6 791 106
4.	проезд Енисейский, 7 (Заводской район)	500000000002008102	0,0478	375 460 800	38 000 000	5 761 190
5.	ул. Чекалина, 49 (Заводской район)	500000000002008104	0,0440	345 602 400	35 000 000	6 100 140
6.	земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район)	500000000008005469	0,0754	883 064 750	90 000 000	2 168 213
7.	земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район)	500000000008005076	0,0736	861 990 290	87 000 000	1 864 388
8.	земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район)	500000000008005482	0,0733	858 469 250	86 000 000	2 168 213
9.	земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район)	500000000008005372	0,0700	819 824 110	82 000 000	1 864 388
10.	земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район)	500000000008005371	0,0638	747 211 290	75 000 000	1 864 388
11.	пер. 1-й Артема, 17 (Заводской район)	500000000002007983	0,0590	471 860 520	50 000 000	4 927 614
12.	ул. Таежная, 45 (Партизанский район)	500000000001033858	0,0512	417 290 750	42 000 000	5 148 923
13.	пер. 1-й Зубачева, 12 (Октябрьский район)	500000000004004874	0,0511	492 811 260	50 000 000	4 927 614
14.	пер. 1-й Детский, 15 (Заводской район)	500000000002007735	0,0476	445 820 130	45 000 000	2 168 213

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Земельные участки, расположенные в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска, имеют пониженный рельеф местности, высокий уровень залегания грунтовых вод, представлены торфяными почвами. Инженерно-геологические условия территории ограниченно благоприятные для строительства на естественном основании. Осложняющими факторами являются условия поверхностного стока, во влажные периоды года возможно застаивание атмосферных и талых вод в понижениях микрорельефа.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 25 октября 2013 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 21 октября 2013 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 10 октября 2013 г. по 21 октября 2013 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 12 ноября 2013 г. проводит открытый аукцион № 16-А-13 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. На торги выставляется **право аренды на 99 лет 9 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске:**

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Хмаринская, № 166 по схеме (Советский район)	500000000008005668	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
2.	ул. Хмаринская, № 167 по схеме (Советский район)	500000000008005669	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
3.	ул. Хмаринская, № 168 по схеме (Советский район)	500000000008005670	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
4.	ул. Хмаринская, № 169 по схеме (Советский район)	500000000008005671	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
5.	ул. Хмаринская, № 170 по схеме (Советский район)	500000000008005672	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
6.	ул. Хмаринская, № 171 по схеме (Советский район)	500000000008005673	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
7.	ул. Хмаринская, № 172 по схеме (Советский район)	500000000008005674	0,0914	564 993 090	60 000 000	7 437 326
8.	ул. Хмаринская, № 173 по схеме (Советский район)	500000000008005675	0,0936	578 594 320	60 000 000	7 437 326
9.	ул. Хмаринская, № 174 по схеме (Советский район)	500000000008005676	0,1006	621 866 820	65 000 000	7 437 326

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями.

Аукцион состоится **12 ноября 2013 г. в 11[00] по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после подписания договора аренды земельного участка;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить гражданину – не позднее одного года, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – не позднее 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного блокированного жилого дома.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 5 ноября 2013 г. в вышеуказанном (графа 6 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 14 октября 2013 г. по 5 ноября 2013 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 99 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (юридическое лицо, индивидуальный предприниматель в предусмотренных законодательством случаях в течение 6 месяцев, а гражданин в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта) должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: **www.mgcn.by.**

■ З мэтай прафілактыкі

ПРЫШЧЭПКІ — БЯСПЕКА ГРАМАДСТВА, А НЕ ЗМОВА

Сезон прышчэпак ад грыпу пачынаецца ў напружанай атмасферы, піша польскае выданне Polityka. Ніколі раней у Польшчы не былі настолькі моцнымі антыпрышчэпачныя настроі!

У мінулым асенне-зімовым сезоне прышчэпку ад грыпу зрабілі... менш за 4 працэнты палякаў (чатыры гады таму было 7 працэнтаў, потым — 5, затым — 4,5). Магчыма, Польшча ператворыцца ў еўрапейскага аўтсайдара? Цалкам верагодна. Нядаўна Вышэйшы адміністрацыйны суд вынес рашэнне: санслужбы не маюць права хоць нейкім чынам караць бацькоў, якія не робяць сваім дзецям планавых прышчэпак. Суддзі, праўда, заявілі, што выносіць пакаранне ў гэтым выпадку ўпаўнаважаны ваяводы, аднак для правядзення кантрольных мерапрыемстваў у тых няма ні адпаведных інструментаў, ні кадраў. Антыпрышчэпачны рух святкуе перамогу і заклікае бацькоў, якім раней давялося заплаціць штрафы, падаць запыты на спыненне спраў і вяртанне грошай (сума штрафу — ад 100 да 1000 злотых).

У папулярнай польскай тэлепраграме «Рэпарцёрскае расследаванне», запрошаная ў студыю адвакат спакойна заявіла, што «абавязковая вакцынацыя нагадвае прымусовую саветызацыю 50-х гадоў».

У папулярнай польскай тэлепраграме «Рэпарцёрскае расследаванне», якая закранала сёлета тэму прышчэпак, запрошаная ў студыю адвакат спакойна заявіла, што «абавязковая вакцынацыя нагадвае прымусовую саветызацыю 50-х гадоў». Антыпрышчэпачны бунт аб'ядноўвае з аднаго боку — кансерватыўных традыцыяналістаў, а з другога — арыентаваных на экалогію лібералаў. «Маё цела стварыў Бог, яно само лечыць сябе і рэгулюе свае працэсы, ніводзін чалавек не зробіць гэта лепш за Бога» — гэтае крэда рэлігійных фундаменталістаў мала адрозніваецца ад «экалагічнага» светапогляду аматараў натуральнай медыцыны, якія вераць у самавылечванне арганізма без падтрымкі нейкіх хімічных і біялагічных сродкаў.

Калі гаварыць пра медыцынскія аргументы праціўнікаў вакцынацыі, то ў іх больш псеўданавуковага. Адзін польскі вандроўнік мяркуе, што пасля прышчэпкі «арганізм заняты выпрацоўкай антыцелаў супраць непатрэбных хвароб, а калі з'яўляюцца іншыя інфекцыі, у імуннай сістэмы застаецца толькі 15 працэнтаў свабоднай магутнасці для барацьбы з імі, таму прышчэпленыя людзі хварэюць значна цяжэй, чым тыя, хто ніколі не прышчэплівaўся».

Дыскусія вакол сэнсу вакцынацыі — не толькі экалагічная ці рэлігійная спрэчка. Гэта яшчэ рэакцыя на памылкі фармацэўтычнага бізнесу і няўдачы ў маркетынгу лекаў, якія апошнім часам падарвалі давер да экспертаў. Рэзкае падзенне колькасці прышчэпленых ад грыпу адбылося пасля жорсткіх спрэчак вакол набыцця вакцыны супраць так званага свінога грыпу ў сезоне 2009-2010. І хоць на той момант міністр аховы здароўя Эва Копач выйшла пераможцай з-пад абстрэлу апазіцыі, адмовіўшыся набываць буйную партыю вакцыны, уся гэтая шуміха не спрыяла прапагандзе такой формы прафілактыкі.

«Антыпрышчэпачнікі» прыводзяць звычайна адны і тыя ж аргументы. **Па-першае,** навошта прышчэплівацца ад віруса, які быў летась? Кожны год сусветная арганізацыя аховы здароўя на аснове даных папярэдняга сезона грыпу вызначае найбольш верагодны тып віруса, які размнажаюць, забіваюць і размяшчаюць у новых вакцынах. **Па-другое,** калі б такая форма прафілактыкі была эфектыўнай, прышчэпленыя людзі не заражаліся б такімі інфекцыямі. **Па-трэцяе,** ці не таіцца за ўсім гэтым змова фармацэўтычных кампаній і працадаўцаў, якія хочуць проста на нас нажыцца і прымусіць працаваць? Хоць у тым, каб перахварэць на грып, няма нічога страшнага — дастаткова ўзяць бальнічны і паляжаць у ложку...

«З падобнымі аргументамі складана наогул спрачацца, — адказвае супрацоўнік фонду «Інстытут прафілактыкі інфекцыйных захворванняў» Павел Гжэсеўскі. — Вакцына не можа выклікаць грып, паколькі не змяшчае жывых вірусаў. Аднак яна не абараняе ад іншых інфекцый, якія таксама могуць выклікаць кашаль, насмарк, сінусіт».

Сапраўды, прышчэпка ад грыпу не абараняе на 100 працэнтаў, і кожны з нас можа аказацца ў групе некалькіх працэнтаў людзей, якія ўсё роўна заразяцца. Але нават калі нам не пашчасціць, хвароба, хутчэй за ўсё, пройдзе лягчэй, а таксама нам не будуць пагражаць небяспечныя ўскладненні: запаленне лёгкіх, пашкоджанні сэрца, ныркавая недастатковасць. Грып — гэта не звычайная прастуда, а небяспечнае захворванне, здольнае прывесці да летальнага зыходу (у мінулым, не самым напружаным сезоне ад ускладненняў пасля грыпу ў Польшчы памерлі каля 150 чалавек).

Эксперты папярэджваюць, што адмова ад прафілактыкі ў хуткім часе можа прывесці да рэзкага пагаршэння інфекцыйнай абстаноўкі. Нічога, калі б гэта датычылася толькі грыпу, аднак калі працэнт непрышчэпленых людзей на канкрэтнай тэрыторыі перавышае 10 працэнтаў, інфекцыі зноў пачынаюць пагражаць. Поліеміеліт або дыфтэрыт удалося перамагчы дзякуючы таму, што масавая вакцынацыя ахапіла практычна 100 працэнтаў папуляцыі. На жаль, таго ж не скажаш пра адзёр, коклюш, свінку, краснуху, прышчэплівацца ад якіх жадаюць не ўсе. Прыхільнікі «свабоды выбару» ігнаруюць той факт, што прышчэпкі абараняюць не толькі асобнага чалавека, але ў першую чаргу — грамадства, і менавіта таму становяцца абавязковымі.

У той час як у Польшчы заканадаўства змякчаюць, у Аўстраліі яго робяць больш жорсткім. Нядаўна там аб'явілі, што бацькі, якія адмаўляюцца прышчэпліваць дзяцей, будуць пазбаўляцца дапамогі, якая з'яўляецца формай падаткавай ільготы. Занепакоеныя эпідэміёлагі ў Польшчы прапануюць сваё рашэнне сітуацыі. Калі нікога нельга прымушаць рабіць прышчэпкі, можна ўвесці палажэнне, па якім бацькі будуць самастойна аплачваць лячэнне непрышчэпленага дзіцяці.

Польскі каляндар прышчэпак састарэў. Паколькі асноўнае значэнне для ўлад мае кошт вакцын, якія фінансуюцца з бюджэту, а мінфін скарачае расходы ў тым ліку ў ахове здароўя, Польшча пачынае моцна адставаць ад іншых краін ЕС.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ 10 кастрычніка — Сусветны дзень псіхічнага здароўя

ГЭТА ЎЖО НЕ ПРОСТА САПСАВАНЫ НАСТРОЙ

Пагаршэнне настрою дэпрэсіўнага характару не проста небяспечнае, як пра гэта прынята думаць, а нашмат небяспечней. Прыгнечаным, сумным, маркотным адчувае сябе час ад часу кожны, аднак кожны пяты з тых, хто сёння маркоціцца, мае патрэбу ў лячэнні пад наглядам урача.

— Калі не звяртаць увагі на змену свайго стану, маркота, або дэпрэсіўны стан, можа паглыбляцца далей: з'явіцца туга, думкі аб уласнай віне і непрыдатнасці, дарэмнасці існавання, — расказвае **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога псіханеўралагічнага дыспансэра Ігар САРОКІН**. — Страчваецца цікавасць да ўсяго, што раней складала значную частку жыцця: сям'я, праца, сябры, хобі. Жыццё пачынае здавацца наогул бязрадасным, у шэра-чорным колеры. Становіцца цяжка думаць, выконваць нават нескладаную, звыклую працу. З'яўляюцца і фізічныя праявы: пачашчанае сэрцабіццё, павышаецца або паніжаецца артэрыяльны ціск, мяняецца апетыт, вага, з'яўляецца сухасць у роце, слёзы або целкам знікаюць, або часцей наварочваюцца, зніжаецца лібіда. Нярэдка менавіта фізічныя сімптомы выходзяць на пярэдні план і пачынаюць турбаваць чалавека.

Такі чалавек пачынае хадзіць па кабінетах паліклінікі, праходзіць шматлікія абследаванні. Аднак дапамагчы такому хвораму здольны не тэрапеўт ці неўролаг, а толькі псіхатэрапеўт або псіхіятр.

Звяртацца да гэтых спецыялістаў неабходна, калі на працягу двух тыдняў (не менш) назіраюцца наступныя праявы:

— зніжаны настрой;

— адсутнасць задавальнення ад жыцця;

— адасабленне ад сяброў, сям'і;

— зніжэнне здольнасці да выканання звыклай працы, нежаданне чым-небудзь займацца, нават сачыць за знешнім выглядам;

— слабасць, цяжкасці ў канцэнтрацыі ўвагі, здольнасці да разваг, бессань або санлівасць, думкі пра ўласную віну ці нікчэмнасць;

— перыядычнае ўзнікненне думак аб смерці, самагубстве.

Маркота, або дэпрэсія, мае і біялагічныя прычыны. Вядома, што маркота абумоўлена нізкай колькасцю сератаніну — рэчыва, з дапамогай якога зладжана працуе наш галаўны мозг. Сёння дакладна невядома, з якой прычыны зніжаецца ўзровень гэтага рэчыва. Заўважана, што гэта можа назірацца ў выніку некаторых захворванняў, працяглага стрэсу.

Дэпрэсія можа быць больш ці менш цяжкай. У залежнасці ад цяжару псіхічнага парушэння псіхіятр падбірае медыкаментозны сродак (антыдэпрэсант), з дапамогай якога можна павысіць узровень сератаніну ў пэўных структурах галаўнога мозгу, а значыць, палепшыць настрой, вярнуць фізічную і псіхічную актыўнасць, працаздольнасць, аптымізм, нармальны апетыт, начны сон, палепшыць агульнае самаадчуванне.

Сучасныя антыдэпрэсанты не выклікаюць прывыкання і залежнасці. Хоць любы медыкамент, акрамя лячэбнага, мае і непажаданыя эфекты. Пра гэтыя эфекты можна даведацца ў свайго ўрача. Звычайна непажаданыя эфекты праяўляюцца ў лёгкай форме і неўзабаве пасля пачатку прыёму знікаюць.

Звычайна патрабуецца ад 7 да 14 дзён, каб пацыент заўважыў першыя змены да лепшага. Поўны выхад з хваравітага стану адбываецца ў некалькі этапаў: купіраванне хваравітых праяў, стабілізацыя стану, прафілактыка рэцыдыву.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА

■

ПАРАДЫ ДЛЯ ЎСІХ

ПАБОЛЕЙ РУХУ, СВЯТЛА І ВОДАРУ ВАНІЛІ!

1. *Імкніцеся вытрымліваць рэжым дня. Кожная хвіліна жыцця павінна быць змястоўнай. Вы павінны ведаць, што чакае вас у наступную гадзіну, калі вы скончыце займацца тым, што робіце цяпер.*

2. *Майце на ўвазе, што лепшы сродак ад дэпрэсіі — праца.*

3. *Кладзіцеся спаць і прачынайцеся ў адзін і той жа час. Не дазваляйце сабе качацца ў ложку нават у выхадныя. Спіце на менш за 7-8 гадзін у суткі.*

4. *Дазваляйце сабе маленькія радасці (купіце што-небудзь прыемнае, наведайце выставу, спектакль).*

5. *Не засяроджвайцеся на негатыўным.*

6. *Добраму настрою спрыяе водар эфірных алеяў ружы, чайнага дрэва, ванілі, герані, рамонку, мяты. 2-3 кроплі эфірнага алею на сурвэтцы можна прымацаваць над электрычнай лямпачкай. Гэтага будзе дастаткова для араматызацыі пакою ў вячэрні час.*

7. *Яркае святло таксама паляпшае настрой.*

8. *Не забывайцеся на штодзённую фізічную і псіхічную актыўнасць.*

ГАВАРЫЦЕ ЦІШЭЙ — НЕ НЕРВУЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) сцвярджае, што дзеці ў найбольшай ступені схільныя да шкоднага ўздзеяння шуму. Шум адмоўна адбіваецца на іх пазнавальных здольнасцях і самаадчуванні. Эксперты кажуць, што пры рэгулярным уздзеянні шуму адзначаецца дысфункцыя ўвагі, памяці, складанасці пры вырашэнні задач і навучанні чытанню. Школьныя настаўнікі пачалі барацьбу з грукатам, прывіваючы будучым пакаленням навыкі захавання цішыні, піша іспанскае выданне La Vanguardia.

У ім, у прыватнасці, паведамляецца, што дзеці трэцяга класа дзяржаўнай сярэдняй школы адной іспанскай правінцыі рэгулярна слухаюць спевы птушак, шум марскога прыбою, вуханне соваў і гук дажджу. Яны цудоўна разумеюць, што шум — гэта «непрыемны гук», «тое, што моцна раздражняе», «стрэс для галавы», «робіць балюча вушам». Школьнікі акуратна ставяць свае крэслы на сталы, надзяваюць заплечнікі і ветліва развітваюцца са сваімі настаўнікамі.

Дарэчы, Іспанія з'яўляецца другой краінай у Еўропе па ўзроўні шуму. Таму адна з педагогаў і прапанавала некалькі крокаў для барацьбы з праблемай. Настаўніца прыйшла да высновы, што павышэнне гучнасці голасу ўжо робіць дзяцей больш нервовымі.

СААЗ лічыць 70 дэцыбел (шум пыласосу) максімальна дапушчальным узроўнем. Слыхавая стомленасць пачынае праяўляцца пры ўзроўні шуму ў 80 дэцыбел, а 90 могуць выклікаць незваротныя пашкоджанні слыху, якія будуць тым цяжэй, чым больш часу чалавек падвяргаецца ўздзеянню і чым вышэй яго індывідуальная адчувальнасць. Шэраг даследаванняў указваюць на тое, што **ўздзеянне шуму ў дзяцінстве выклікае парушэнні, якія ў дарослым узросце абвастраюцца.** Глухата закладваецца ў дзяцінстве.

Пакуль у адных краінах адукацыя развіваецца ў атмасферы шуму, у іншых гэта праблема знаходзіцца пад пільным кантролем. Так, у Фінляндыі, дзе адукацыйную сістэму можна лічыць узорам для перайманння, нават у школьных сталовых установлены святлафоры, якія адлюстроўваюць узровень шуму ў дэцыбелах.

СААЗ нагадвае, што ўзровень шуму ў 35 дэцыбел «забяспечвае добрыя ўмовы адукацыі і засваення матэрыялу». У хатніх жа ўмовах неабходна трымацца простых правілаў: тэлевізар не павінен працаваць пастаянна, узровень шуму цацак не павінен перавышаць 85 дэцыбел (на цацках павінна быць маркіроўка CE, што адпавядае стандартам Еўрасаюза), навушнікі павінны мець абмежавальнікі гуку на ўзроўні 85 дэцыбел.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА

■

■ Гарадскія паданні

ААЗІСЫ, ЗАКУТЫЯ Ў КАМЕННЕ

А ці вядома вам, што ў Мінску сёння больш за 60 фантанаў? Напрыканцы сезона іх работы мы з экскурсаводам Ірынай Шорац наведалі некаторыя. Перад тым, як яны спыняць бруенне сваіх водаў да вясны, мы яшчэ паспелі палюбавацца вірлівымі (а дзесьці — спакойнымі) воднымі струменямі, паглыбіцца ў гісторыю сталічных крыніц і даведацца пра іх асаблівасці.

«Дрэва сусвету» на вуліцы Леніна.

ДЭСАНТНІК ЛЕБЕДЗЮ НЕ ТАВАРЫШ

Сустрэча была прызначана, вядома, ля фантана. І не якога-небудзь, а самага першага, а значыць, самага старога ў горадзе — славутага «Хлопчыка з лебедзем», што ў Аляксандраўскім скверы. Праўда, нягледзячы на запэўненні прадстаўнікоў унітарнага прадпрыемства «Мінскзелянбуд», якія адказваюць за работу гэтага і яшчэ трох дзясяткаў сталічных каскадаў, вада ў ім ужо не струменіла. Затое нябесная канцылярыя, здаецца, вырашыла кампенсаваць адсутнасць вады ў зямных фантанах дажджом з неба. Але ці варта было баяцца прамокнуць тым, хто і без таго выправіўся на «мокрую справу»?

Пра няякасную ваду дэгустатар казаў «не фантан». Цяпер гэтае выслоўе пашырыла сферу ўжытку, захаваўшы пры гэтым сваё першаснае значэнне.

Узяўшы на ўзбраенне парасоны, мы пазнаёміліся з гісторыяй «Хлопчыка з лебедзем». Падзея, якая паслужыла яго з'яўленню, стала ў свой час сапраўды грандыёзнай: у Мінску быў праведзены водаправод. Адбылося гэта ў 1874 годзе, і гэтую дату цяпер можна ўбачыць на скульптурнай кампазіцыі фантана, створанай італьянскім майстрам Флярэнца Бернініі. «Раней вакол скульптуры сядзелі яшчэ шэсць жабак, цяпер іх няма. Але гэтай восенню «Мінскзелянбуд» збіраецца адрэстаўраваць фантан і вярнуць гэтых жабак», — паведаміла Ірына Шорац. Першую сур'ёзную рэстаўрацыю (займаўся якой, дарэчы, Заір Азгур) «Хлопчык з лебедзем» перажыў толькі ў 1980 годзе. У майстэрні скульптара фігура апынулася пасля Дня паветрана-дэсантных войскаў: дэсантнікі так актыўна адзначалі свята, што падчас купання ў фантане зламалі лебедзю шыю.

СІВЫЯ ЛЕГЕНДЫ БРУІСТАЙ ВАДЫ

Ад Аляксандраўскага сквера мы накіроўваемся на вуліцу Леніна, дзе месцяцца ажно два фантаны. Дзіўна, але звычайна, ходзячы па горадзе ў паўсядзённых справах, іх проста не заўважаеш. Аказваецца, дарэмна, бо яны сапраўды вартыя ўвагі. Першая з крыніц — статычна-дынамічны фантан, які выпускае струмені з рознай інтэнсіўнасцю, пасля суцішваецца на некаторы час і зноў струменіць. Такое адчуванне, што вада вось-вось падымецца вышэй і замочыць таго, хто блізка падышоў да яе. Але фантан параўнальна «бяспечны» ў гэтым плане, у адрозненне ад так званых фантанаў-шуціх, якія ўпершыню з'явіліся ў Пецяргофе на загад Пятра I. Такім чынам цар любіў палохаць і здзіўляць сваіх гасцей.

Другі фантан, схаваны за помнікам С.І. Грыцаўцу, увасабляе старажытны светапогляд нашых продкаў. «Прашчуры ўяўлялі сусвет у выглядзе дрэва, — тлумачыла экскурсавод. — Крона — гэта неба, на якім жывуць багі і птушкі, ствол — гэта месца для людзей і жывёл, якія дапамагаюць ім у гаспадарцы. Каля каранёў знаходзяцца дзікія звяры, а пад карэннем — змеі і падобныя ім істоты». І сапраўды, фантан гэты зроблены ў выглядзе старажытнага дрэва сусвету. Вось так нечакана ў цэнтры сучаснага мегаполіса можна знайсці напамін аб народнай міфалогіі.

МІКРАЧЫПЫ І ФАНТАН-ТЭАТР

У Старажытным Рыме фантаны былі ў кожным дворыку. І гэта была не раскоша, а неабходнасць: ваду з іх выкарыстоўвалі для гаспадарчых патрэб. Дарэчы, сістэма ўсталявання такіх штучных крыніц з тых часоў амаль не змянілася, хіба што сталі выкарыстоўваць новыя матэрыялы і тэхналогіі. Як у старажытнасці, так і цяпер пры будаўніцтве фантана першнаперш пракладаюць водаправод — трубы, па якіх пад ціскам будзе ісці вада. Ціск гэты звычайна ствараецца пры дапамозе помпы, але ёсць каскады (як, напрыклад, у Пецяргофе), дзе водная плынь перацякае дзякуючы перападам рэльефу мясцовасці.

«Хлопчык з лебедзем» — самы вядомы сталічны фантан.

У сістэме сучасных мінскіх фантанаў выкарыстоўваюць эканамічныя тэхналогіі: вада ў іх курсіруе адна і тая ж, сцякаючы ў водаправод і зноў падымаючыся па трубах угору. А яшчэ новымі сталічнымі «вадамётамі» кіруе камп'ютарная тэхніка. Яны абсталяваны мікрачыпамі, якія падаюць сігнал у Мінскзелянбуд пра няспраўнасць таго ці іншага каскада. Дарэчы, часцей за ўсё непаладкі здараюцца з той прычыны, што людзі «блытаюць» фантаны з басейнамі, купаюцца ў іх і кідаюць смецце.

Самы вялікі па колькасці струменяў фантан у Мінску знаходзіцца на Кастрычніцкай плошчы каля Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён складаецца з 1300 струменяў, якія падымаюцца на розную вышыню да сямі метраў, і мае падсветку. На жаль, цяпер ён не працуе нават улетку. Таксама адзін з самых вялікіх і прыгожых фантанаў горада месціцца каля Тэатра оперы і балета. Ён займае пляцоўку даўжынёй 70 метраў, падымаючы ў паветра там 300 літраў вады адначасова. Цікава, што сам каскад задумваўся стваральнікамі таксама як своеасаблівы тэатр: цэнтральныя струмені вады, якія ўздымаюцца вышэй за астатнія, сімвалізуюць сцэну, на якой адбываецца дзея. А парогі, па якіх вада сцякае ад цэнтра кампазіцыі, — гэта гледачы.

У Старажытным Рыме фантаны былі ў кожным дворыку. І гэта была не раскоша, а неабходнасць: ваду з іх выкарыстоўвалі для гаспадарчых патрэб.

У АТМАСФЕРЫ ТАНЦАЎ, СПЕВАЎ І КАХАННЯ

Адна з самых адметных гарадскіх крыніц — фантан на плошчы Незалежнасці з busламі і гербамі абласных гарадоў краіны. Складаецца ён з 700 струменяў і мае больш за 10 канфігурацый. Пры праектаванні меркавалася, што гэты каскад будзе «спяваць» і «танчыць». Але «спевы» і «танцы» фантана абмежаваліся рупарамі на слупах, з якіх гучаць мелодыі (хоць насамрэч вада павінна была струменіць у рытме музыкі). Але тым не менш у Мінску ёсць «вадамёт», які насамрэч «танцуе». Ён месціцца на праспекце Пераможцаў каля Палаца спорту, і струмені ў ім сапраўды рухаюцца пад музыку.

Чаму «танцы вады» на плошчы Незалежнасці атрымаліся, вобразна кажучы, «не фантан» — сказаць цяжка. Затое вядома, адкуль пайшоў гэты самы выраз. Гісторыя гэта звязана з Адэсай. Калі ў горадзе яшчэ не было водаправода, ваду прывозілі сюды з іншых месцаў. І нават быў спецыяльны чалавек, які яе каштаваў. І калі, паспытаўшы, ён казаў, што вада — «фантан», значыць, яна сапраўды чыстая, прыдатная для ўжывання, з фантана. Адпаведна, пра няякасную ваду дэгустатар казаў «не фантан». Цяпер гэтае выслоўе пашырыла сферу ўжытку, захаваўшы пры гэтым сваё першаснае значэнне.

А непадалёк ад кампазіцыі на плошчы Незалежнасці ў рамантычнай засені вербаў нібы сарамліва схавалася ад гарадскога тлуму фантанная кампазіцыя «Юнацтва». Выява хлопца і дзяўчыны, якія трымаюць кубкі — пэўна, з чароўным напоем кахання. Узнікла яна тут у 1980-х гадах, і з тых часоў з'яўляецца адным з улюбёных месцаў адпачынку закаханых парачак.

Па-за нашай увагай засталося яшчэ шмат цікавых і прыгожых гарадскіх фантанаў. У кожнага з іх — свая гісторыя, легенда ці назва. Хаця відавочна, што мінчане любяць водныя крыніцы не столькі за гэта, колькі за магчымасць палюбавацца на заспакаяльнае цячэнне вады, парэлаксаваць і крыху наблізіцца да прыроды ў тлумным мітуслівым горадзе. А які ваш любімы фантан у Мінску?

Дзіяна СЕРАДЗЮК. Фота аўтара

■

Каскад ля Камароўскага рынку.

■ Сустрэча без абцасаў

«У ЖЫЦЦІ ВЕЛЬМІ ВАЖНА ДАЧАКАЦЦА СВАЙГО ЧАЛАВЕКА»

Ніколі не трэба адмаўляцца ад шанцу, які прапануе жыццё, інакш яно можа пакрыўдзіцца, лічыць дырэктар цэнтра лазернай карэкцыі зроку «Оптымед» Настасся УНУЧАК. Такой жыццёвай філасофіяй, прызналася, кіравалася і сем гадоў таму, калі ёй, 25-гадовай дзяўчыне, прапанавалі заняць крэсла кіраўніка.

ПРА ЎЗРОСТ, БЕЛАРУСКАМОЎНУЮ ГІМНАЗІЮ І ЖАНОЦКАСЦЬ

Заўважыла, што з узростам мы робімся больш разважлівымі. Таму, калі б мне зараз прапанавалі ўзначаліць «Оптымед», пэўна, сто разоў падумала б, усё ўзважыла. А тады, у 25, я была амбіцыйная, поўная энтузіязму і жадання працаваць менавіта ў гэтай кампаніі. Таму прапанову прыняла з лёгкасцю.

Нарадзілася я ў Мінску, у інтэлігентнай сям'і інжынераў. Вучылася ў беларускамоўнай гімназіі, займалася фігурным катаннем, танцамі, на скрыпцы іграла, нават у дзіцячым хоры спявала. Калі прыйшоў час думаць пра паступленне, вырашыла стаць юрыстам. А на чацвёртым курсе яшчэ паступіла і на завочнае аддзяленне эканамічнага факультэта на менеджмент. Тады юрыст і эканаміст былі самымі прэстыжнымі прафесіямі.

На Захадзе лячэнне і менеджмент не перасякаюцца. На мой погляд, гэта правільны падыход: кожны павінен займацца тым, што ў яго добра атрымліваецца. Толькі тады ў працы будзе нейкі толк. А ў нас часцяком на месца галоўнага ўрача ставяць самага кваліфікаванага хірурга, тым самым пазбаўляючы яго магчымасці дапамагаць людзям. Я ўпэўнена: урачы павінны лячыць, а не вырашаць арганізацыйныя пытанні.

На бізнес-сустрэчах важна выклікаць у патэнцыйных партнёраў першае станоўчае ўражанне: манеры, прыемная знешнасць, прыгожае адзенне... А далей павінны падключацца веды і прафесіяналізм. Калі гэтага няма, «жаночыя штучкі» не спрацуюць. Часцей я «уключаю» сваю жаноцкасць па-за працай: калі машынка зламалася, кола трэба памяняць. «Дапамажыце, я тут уся такая бландзінка». Мужчыны любяць нам у такім стане дапамагаць. Але калі вырашаюцца пытанні бізнесу, гэта не спрацуўае. Тут галоўнае — кампетэнтнасць.

Па натуры я дастаткова прамы чалавек. Інтрыгі — гэта не для мяне. Мне блізкая прамая гульня. Лепш сказаць шчыра, чым хадзіць кругом ды навокал.

ПРА ЧУЖЫЯ ГРОШЫ, АПАРАТНУЮ КАСМЕТАЛОГІЮ І АРЫСТАКРАТКУ

Калі ва ўніверсітэце марыла пра тое, каб адкрыць сваю юрыдычную кантору, то цяпер з цяжкасцю ўяўляю сябе па-за медыцынскай сферай. Праўда, медыцынскі бізнес вельмі дарагі: адно абсталяванне колькі каштуе! Для таго, каб адкрыць кампанію «Оптымед», у свой час патрабаваўся мільён долараў. У мяне такіх грошай няма. Таму пакуль сур'ёзна не задумваюся аб сваёй справе. Тым больш у мяне нядрэнна атрымліваецца «гуляць» чужымі грашыма. І я бачу арыстакраткай. Каб матэрыяльны складнік не быў падставай маіх дзеянняў. З легендарных людзей мяне вельмі натхняе Елізавета Баварская, жонка Франца Іосіфа. Натхняе сваёй здольнасцю заставацца сабой пры любых абставінах, выказваць думкі, нават калі трэба пайсці насуперак усяму аўстрыйскаму двару. Магчымасць быць сабой — прэрагатыва абраных.

Нават самыя паспяховыя павінны развівацца, ісці далей, удасканальвацца. Як толькі ты адчуеш сваю «зорнасць», гэта будзе пачаткам твайго канца, дарогі ў тупік.

ПРА ПЛАСТЫКУ МОЗГА, ІНТЫМ І ЧЫСТКУ

Дзякуючы «Оптымеду» ў нашу краіну ў 1998 годзе прыехала лазерная карэкцыя зроку. І сёння ў Беларусі можна атрымаць лячэнне вачэй не горшае, чым у Еўропе. Вывезіце на міжнародны кангрэс — пацверджу. Так, два гады таму мы ўкаранілі ў Беларусі методыку «СуперЛасік»: калі пры лазернай карэкцыі ўлічваюца індывідуальныя няроўнасці на рагавіцы. Гэта дае больш якасны зрок. Мы жывём у цудоўны час, калі ўсё немагчымае магчыма.

Чалавек сам выбірае: хадзіць у лінзах ці акулярах альбо зрабіць карэкцыю зроку. Многія з блізкіх мне людзей таксама марылі адноўчы прачнуцца і выдатна бачыць без лінзаў. Але часам аднаго жадання недастаткова... Па маіх назіраннях, толькі каля 75% з тых, хто хоча зрабіць карэкцыю, прахадныя. Астатнія, на жаль, не могуць сабе гэтага дазволіць па медыцынскіх супрацьпаказаннях. Самая папулярная прычына — тонкая рагавіца. Але і такім пацыентам можна прапанаваць альтэрнатыву лазернай карэкцыі — замену крышталіка.

Сёння асобныя жанчыны не лечаць зубоў (няхай гніюць), але штосьці робяць са сваім тварам. Не чытаюць добрых кніг, не імкнуцца развівацца, але пры гэтым змяняюць розныя часткі свайго цела. Дзіўнае жыццё, дзіўныя людзі. У плане бізнесу я «за», пляскаю ў далоні. Чаму б не злавіць хвалю, калі гэта запатрабавана. У плане асабістага светаадчування я б зрабіла гэтым людзям пластыку мозга.

Пасля пластычнай аперацыі ў жанчын цяжкая рэабілітацыя. Яны як мінімум месяц ляжаць дома. Я б ніколі свядома не аховаравала цэлым месяцам свайго жыцця.

Звяртаюся да ўрачоў толькі ў крайніх выпадках. Рэгулярна наведваю стаматолага, гінеколага, раз на год правяраюся ў афтальмолага. Нядаўна мая стаматолаг з'язджала ў адпачынак і парэкамендавала мне звярнуцца да сваёй калегі. Адмовілася, бо я ў такіх пытаннях кансерватар. Для мяне гэта ўсё вельмі інтымна.

Да касметолага, прызнаюся, стала хадзіць толькі сёлета, разумею, што трэба адсочваць узроставыя змены. Аднойчы паспрабавала чыстку, мне гэта не спадабалася. Зразумела, што не хачу рабіць тое, што балюча і не прыносіць мне задавальнення. Таму раблю толькі прыемныя працэдуры: масаж, напрыклад.

ПРА РАЗЫНКІ, ПРЫГОЖУЮ СТАРАСЦЬ І «ХАЧУ — НЕ ХАЧУ»

У кожнага з нас ёсць нейкія недахопы, але нават іх можна паднесці як разынкі. Праблема ў тым, што жанчыны сябе не любяць. Безумоўна, прасцей за ўсё перакласці адказнасць за сябе, нешчаслівую, на мужчыну. Маўляў, муж не такі, грошай не зарабляе. Складаней — набрацца смеласці і памяняць што-небудзь у сваім жыцці. Я цвёрда перакананая, што калі жанчына няшчасная, то яе ніхто не зможа ашчаслівіць, акрамя яе самой. Мужчына можа толькі дапамагчы, быць каталізатарам.

Жыццё не заўсёды зэе яркімі фарбамі, але трэба імкнуцца іх знаходзіць.

У мяне ёсць свой стэрэатып прыгажосці. І ён, цалкам дапускаю, можа 300 разоў адрозніваца ад вашага. Не раз такое здаралася: бачу прыгожага чалавека, пачынаю з ім размаўляць — а там такая пустэча, глупства. Глядзіш на яго і не разумееш, дзе падзелася тая прыгажосць... У той жа час чалавек, які зусім не ў тваім густе, можа прыемна здзівіць сваёй глыбінёй, унутранай прыгажосцю. Глядзіш на яго і думаеш: «Які прыгожы!».

Мне падабаюцца жанчыны, якія прыгожа старэюць. Няхай у 50 яна выглядае не на 25, а на 45, але ў яе добрая генетыка, яна добра харчуецца, сочыць за сабой. Многае залежыць і ад унутранага светаўспрымання. Бо большасць хвароб выклікана няццём і незадаволенасцю. Калі аднойчы апусціць плечы і павесіць нос, то так можна і не заўважыць, як жыццё прайшло міма.

Нядаўна мне пашчасціла прыняць удзел у трэнінгу ад літоўскага псіхолага Ірыны Равенсі. Яна казала: «Мілыя дамы, не даказвайце ні свайму мужу, ні сваім калегам, што вы нешта можаце. Бо жанчына, у адрозненне ад мужчыны, можа ўсё. Галоўнае — быць шчырай з самой сабой, задаць сабе пытанне: хочаш ты гэта рабіць ці не?». Згадзіцеся, часта многія робяць нешта, каб коса не паглядзелі сваякі, суседзі ці яшчэ нехта... Усе, хто заўгодна, каму на цябе напляваць. Цяпер, калі ў мяне ўзнікаюць сумненні, я сабе шчыра задаю пытанне: «хачу ці не хачу?» І ведаеце, калі я не забываюся гэта рабіць, атрымліваю ад зробленага значна больш задавальнення.

ПРА ІНФАНТЫЛЬНАСЦЬ, «СВОЙ ЧАС» І БОРШЧ

Апошнім часам у мяне такое адчуванне, быццам свет перавярнуўся. Мужчынскія сацыяльныя ролі перайшлі на жаночыя плечы. Жаночыя — на мужчынскія.

Раней я была інфантыльнай у пытаннях сям'і, наогул не задумвалася пра замужжа. Мужчыны, вядома, былі, але не хацелася выходзіць замуж і нараджаць дзяцей толькі таму, што сваякі хвалююцца, ці таму, што ўсе сяброўкі абзавяліся ўжо сем'ямі. Я не хачу, каб гэта адбылося дзеля «галачкі», як халадзільнік, аўтамабіль або пральная машына ў савецкія часы. І толькі цяпер мяне сталі ўсё больш наведваць думкі пра сям'ю.

Перакананая, што ў кожнага свой час. У жыцці вельмі важна дачакацца свайго чалавека, таго, з кім хочацца прачынацца, снедаць... Самае галоўнае — узаемныя пачуцці. Я хачу, каб мае дзеці раслі ў такой атмасферы, калі іх бацькі кахаюць адно аднаго. Бо мне самой у дзяцінстве заўсёды казалі, што я — плод вялікага кахання.

Не магу сабе ўявіць, што я хатняя гаспадыня, сяджу дома і вару баршчы. У мяне гэта дрэнна атрымліваецца. Я не дапушчу, каб той боршч, катлеты ці лазанню, якія я гатавала без задавальнення, нехта еў. Бо веру ў тое, што негатыўная энергетыка і ежа — несумішчальныя рэчы. Я вельмі даражу сваім часам, таму перыядычна запрашаю хатні персанал, які прыходзіць і прыбірае маю кватэру, займаецца гаспадаркай. Сама ж у гэты час магу зрабіць тое, што мне падабаецца, папрацаваць альбо пабыць са сваімі блізкімі. Гэта, згадзіцеся, лепш, чым калі б я з кіслай мінай пыласосіла альбо мыла падлогу.

Раней думала: «Я так люблю сваю працу, як жа я пайду ў дэкрэт?». Пазбавіцца ад унутранага страху мне дапамаглі жанчыны — удзельніцы і арганізатары конкурсу «Лэдзі Бос» (Настасся, дарэчы, сёлета стала пераможцай гэтага конкурсу. — **Аўт.**). Яны, паспяховыя кіраўнікі і ў той жа час выдатныя жонкі і мамы, даказалі мне, што сям'я і кар'ера — сумяшчальныя паняцці. Дзве арганізаткі конкурсу, як высветлілася, ні дня не сядзелі ў дэкрэтным водпуску. І ніводная з іх не выглядае нешчаслівай і замардаванай жыццём. Паглядзела я на іх і зразумела, што пры жаданні сучасная жанчына зможа правільна расставіць прыярытэты і сумясціць працу і сям'ю.

Усе бар'еры ў нас у галаве! Зносіны з моцнымі яркімі людзьмі — першы крок на шляху вызвалення ад гэтых бар'ераў!

Надзея ДРЫЛА.
Фота Надзеі БУЖАН

СЦІСЛА ПРА ГАЛОЎНАЕ

Не так даўно заўважыла, што нічога ў жыцці не адбываецца проста так. Усе нашы дзеянні і рашэнні рана ці позна прыносяць свае плады.

Злуюся, калі бачу несправядлівасць, безадказнасць, глупства.

Мяркую пра людзей не па словах, а па ўчынках.

Магчыма, **шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік.** Але гэта толькі кароткі адрэзак усяго шляху.

Мне вельмі шкада нешчаслівых людзей, калі бачу, што яны могуць быць шчаслівымі.

Трэба заўсёды імкнуцца рухацца наперад.

МЫ ЕХАЛІ ДАМОЎ

...Я хадзіла ў трэці клас, калі старэйшы брат пасадзіў мяне на матацыкл і навучыў кіраваць. Спачатку — «Каўроўцам», потым «ІЖом», «Явай», а нарэшце «К-750». Магутная тэхніка, вецер, дарога, хуткасць... Разумею байкераў, бо мяне і дагэтуль (унукі вялікія!) часам цягне праехацца, ды што там — нават пагойсаць...

А вось муж мой, больш за 40 гадоў адпрацаваўшы кіроўцам, прычым на розных машынах, — на матацыкл так і не сеў. Хіба што пасажырам?

Дык вось. Аднойчы едзем мы з хутара ад яго бацькоў у вёску да маіх. Едзем на «ІЖы» па калгасным полі. Я рулюю, каханы мой у люльцы сядзіць, ну як той пан... Бо не ён жа вязе, а яго, да таго ж да любімай цешчы, можна сказаць, на бліны...

А на полі тым тонкі дрот нацягнуты. Ім дагэтуль пашу для кароў агароджваюць... Электрапастух называецца. Якраз яго, гэтага пастуха, я і не заўважыла...

Дзякаваць Богу, хуткасць невялікай была, кіламетраў з 20. Таму дрот слізгануў па засцерагальным шчытку на ўзроўні маіх вачэй, тут жа «ссунуў» мяне з матацыкла. Сам жа матацыкл... паехаў далей.

Яшчэ раз дзякую Богу за тое, што не разгубілася: хуценька падхапілася (20 гадоў — не ўзрост), дагнала матацыкл, у люльцы якога спакойна паўляжаў муж, села за руль і як нічога ніякага мы паехалі далей.

Адзінае, што я пачула ад свайго пасажыра, гэта здзіўленае пытанне: «А дзе ты была?». Бо, як высветлілася, ён... не заўважыў майго знікнення!

Такі вось ён быў шчаслівы! Тады... Ды і цяпер, калі ўспамінае гэту гісторыю.

Л. Салей, *г. Скідзель.*

ПАСЛЯ ЛАЗНІ...

Гэта гісторыя здарылася ў той час, калі я пасля заканчэння інстытута працаваў настаўнікам. Вёска была вялікая і з усім неабходным — гэта значыць са школай, поштай, амбулаторыяй, само сабою — з крамамі і, вядома ж, з лазняй.

Па пятніцах хадзіць туды сталі і мы, маладыя настаўнікі...

Помню, добра ў той дзень папарыліся, добра памыліся! Потым зайшлі ў вясковую краму, купілі сапраўднага малдаўскага віна «Граціешці» (што, дарэчы, не дужа і дорага было), выпілі. Калегі ўгаворвалі ўзяць яшчэ па шкляначцы, але я адмовіўся — пашыбаваў дамоў. Яны ж засталіся.

Потым асобныя з настаўнікаў (маладыя ж, сем'яў не было...) пайшлі ў школу — рыхтавацца да ўрокаў на наступным тыдні. Хімік паспрабаваў у настаўніцкай нейкі дослед зрабіць, здаецца, з берталетавай соллю. І трэба ж такому здарыцца, што яна ўспыхнула — падпаліла стальніцу!

І палова бяды, калі б стол быў абы-які, а то ж новенькі: дырэктар зусім нядаўна і, можна сказаць, з боем «выбіў» яго ў райана...

Назаўтра раніцай ён жа, дырэктар, першым прыйшоў у настаўніцкую.

Разгневаўся — гэта мякка сказаць! Тут жа выклікаў і «дапытаў» дзяжурных тэхнічак. Потым, відаць, з іх «падачы», настаўнікаў — хіміі (ён, дарэчы, адразу ж ва ўсім прызнаўся), рускай мовы і чамусьці мяне. «Уляцела» кожнаму!

Аднак прачуханцам справа не скончылася: пасля першага ж урока на дошцы аб'яў у настаўніцкай з'явіўся загад аб вымовах. І зноў жа — усім траім! Дзе ж, думаю, справядлівасць?

Пакрыўджаны, я зноў зайшоў у кабінет дырэктара:

— Калі ласка, — папрасіў, — патлумачце, за што мне аб'явілі вымову? Я ж пасля лазні пайшоў дахаты, у школу нават не заходзіў...

— Але ж мог зайсці? — свідруючы позіркам, спытаў дырэктар. І сам жа за мяне адказаў: — Мог... Таму і вымова.

Абураны, я павярнуўся, каб выйсці.

— Пачакай, — пачулася з-за спіны.

Я азірнуўся.

— Вось папка з загадамі, — паказаў дырэктар. — У ёй, як бачыш, табе вымовы няма. А на дошку я тваё прозвішча спецыяльна ўпісаў, каб іншым непанадна было. Вы ж — настаўнікі!.. А бач, што ўздумалі — пасля лазні чаркаваць... Ды потым яшчэ і ў школу прыходзіць... Каб апошні раз гэта было! Запомніў? Іншым таксама перадай!

...Перадаю: яшчэ раз — цяпер.

Васіль Пяшэвіч,
в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.

АСІЛКАЎ МНОГА НЕ БЫВАЕ

...Талісманам чэмпіянату свету па хакей 2014 года стаў зубр, ён жа хакеіст, ён жа волат, усходнеславянскі міфалагічны асілак. Паводле казак ды легендаў, такія некалі жылі ў нас, такія пахаваны пад курганамі-валатоўкамі.

Але ж не толькі казачнымі асілкамі славіўся і славіцца наш край. Дастаткова ўспомніць трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя або цяжкаатлета Леаніда Тараненку. Яго 475 кілаграмаў у дваябор'і дагэтуль не ўзяў ніхто...

Можна называць і іншыя прозвішчы: як вядомыя ўсім, так і невядомыя — амаль нікому.

...У адной з нашых палескіх вёсак, напрыклад (мне калега расказваў), жыў некалі незвычайна дужы хлопец — пад 2 метры ростам. Дзеці любілі падражніць яго: бегалі следам і крычалі: «Дзядзечка, дастань верабейку!».

Той па характары добры быў: не злаваўся і пстрычак нікому не даваў, бо, мусіць, ведаў, чым гэта можа скончыцца. Але ж шапку з галавы гарэзы пры выпадку сарваць мог. Горш за тое — з ёю падыходзіў да бліжэйшага хлява, браўся рукой за ніжняе бервяно двух верхніх вянцоў, прыпадымаў іх разам са страхой, клаў шапку і... апускаў.

Усё, пішы прапала, бо дастаць той галаўны ўбор не мог ніхто — ні з дзяцей, ні з дарослых, бо не будзеш жа разбіраць пабудову... Так што падшываншам нічога не заставалася, як ісці на паклон да тога асілка — прасіць прабачэння, бажыцца, што болей дражніцца не будуць...

Асілак верыў і «фокус» свой паўтараў: яшчэ раз прыпадымаў вянцы. Шапка такім чынам вярталася на месца — на галаву да свайго гаспадара.

На нейкі час усё заціхала. Але ж здаралася, што ў вёсцы з'яўляўся новенькі ці новенькая (найчасцей хтось прыязджаў да дзядоў ды бабуль)... Ім жа трэба было паказаць сябе найлепш, што называецца, у дзеянні. Таму, забыўшыся на ўсе абяцанні, дзеці зноў беглі за асілкам, зноў прасілі, каб дастаў верабейку...

У выніку нечая мурзатая кепка зноў аказвалася паміж бярвёнамі...

...Зрэшты, не варта думаць, што той асілак меў крыўду на дзяцей. Але ж у росквіце сіл, што называецца, ён паехаў на Поўнач, на заробкі. Недзе там яго след і згубіўся...

А калі б застаўся — тут, у Беларусі, волатаў у нас, напэўна ж, стала б больш?!

Валерый Гаўрыш, *г. Чавусы.*

«ЗДРА-СТВУЦЕ...»

Харошую песню ўперад спявалі: «Школьные годы чудесные, с дружбою, с книгой и с песнею, как они быстро летят, их не воротишь назад...»

Хоць многім, відаць, і хацелася б.

Мая школа была на Піншчыне. Узначальвала яе не проста настаўніца, а заслужаная настаўніца БССР! Чалавек вельмі паважаны, чалавек вядомы... Прычым не толькі ў раёне, — ва ўсёй краіне!

Але ж ёсць людзі, для якіх аўтарытэтаў не існуе. Вось і да нас у школу прыйшоў новы фізік, стаў працаваць (у нас нават класным быў), а ў вольны час... пісаць скаргі ў самыя розныя інстанцыі. І ў першую чаргу, вядома ж, на дырэктара. У школу адна за адной паехалі камісіі.

Тая, як зараз памятаю, была з міністэрства адукацыі і правяраць збіралася не што іншае, як веды, якія дае дзецям дырэктар школы. У спіс тых дзяцей трапіў і наш 9-ы клас.

Усіх вучняў папрасілі прыйсці ў школу на паўгадзіны раней (гэта лёгка сказаць, а прытэпаць раніцай за пяць, за сем кіламетраў?), сесці па адным за парты ў кабінеце геаграфіі. Будзе, маўляў, пісьмовая кантрольная...

Мы яе (а тым больш пры гэтакіх «сведках»!), вядома ж, баяліся. Баяліся настолькі, што перад пачаткам адзін з хлопцаў адчыніў дзверцы шафы, дзе стаялі геаграфічныя карты, пасунуў іх у кут і сказаў:

— Вы сабе як хочаце, а я схаваюся.

Прычым сказаў не жартам, бо пасля гэтых слоў... зайшоў у шафу, роўненька стаў і... зачыніўся.

Паспеў, бо якраз у гэты ж момант у дзвярах з'явіліся высокія «госці» — зайшла тая страшная камісія.

Напэўна, яны здзівілася, не заўважыўшы на нашых тварах аніякага страху — адны ўсмешкі (мы чакалі, што з шафы зараз пачуецца гучнае «Апчхі!»)... Але віду не падалі, — селі за апошнія парты. Дырэктар паміж тым пачала ўрок: на дошцы напісала заданне, уголас прачытала яго, спытала, ці ўсім зразумела?

Мы, дзеці, ахвотна заківалі, бо аказалася, нічога там дужа складанага: ні для нас, тых, хто сядзеў за партамі, ні для Лёніка, што схаваўся ў шафе. Таму ён рашуча расчыніў абедзве дзверцы, ступіў на падлогу.

— Здра-ствуце! — досыць гучна сказаў правяральшчыкам. І спытаў у дырэктара, ці можна сесці.

Гэта было настолькі нечакана і настолькі смешна, што клас — разам з высокай камісіяй і дырэктаркай — проста лёг...

Але ж, адсмяяўшыся, мы напісалі тую кантрольную добра, можна сказаць, не падвялі настаўніцу. А заадно займелі свайго роду «пароль»: бо тое «здра-ствуце!» для ўсіх аднакласнікаў стала не толькі прывітаннем, але і светлым напамінам пра нашы цудоўныя школьныя гады.

Тамара Юргілевіч, *г. Дзятлава.*

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж... *Юбілей, паводле любімай кніжкі — тлумачальнага слоўніка беларускай мовы — гэта гадавіна дзейнасці каго-небудзь або існавання чаго-небудзь, якая вылічваецца звычайна дзесяцігоддзямі, стагоддзямі...*

Рубрыка «Алё, народ на провадзе!», або вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў «Звязды», згадзіцеся, незвычайная (хаця б тым, што сярод аўтараў яе — старыя і маладыя, гараджане і вяскоўцы, з дзвюма вышэйшымі адукацыямі і адной пачатковай, людзі самых розных прафесій, нацыянальнасцяў, веравызнанняў, палітычных поглядаў...). А значыць, і юбілеі ў яе павінны быць такія ж — незвычайныя! Ну вось як вам нашы (у хуткім часе) трынаццаць?.. Нешта ў гэтай даце, здаецца, ёсць. Хто за тое, каб адзначыць яе сустрэчай... з аўтарамі?

Асобныя з іх, дакладна ведаем, «за» (бо гэта ж іх ініцыятыва). Аднак юбілеі, паводле слоўніка, гэта тое, што адзначае грамадскасць. Ці згодна яна? Ці дае дабро?

Будзем чакаць і лістоў, і адказаў. А таксама новых гісторый. Пішыце!

■ Факт

НАСТАЎНІКІ ВУЧАЦЦА, ДЗЕЦІ ВЫБІРАЮЦЬ

Напярэдадні прафесійнага свята настаўнікаў у школе ў аграгардку Цяхцін Бялыніцкага раёна праводзіцца Дзень самакіравання.

Гэтая традыцыя існуе некалькі дзясяткаў гадоў: дзеці і педагогі загадзя рыхтуюцца да вялікага свята. У Дзень самакіравання за парты садзяцца настаўнікі. Калі раней яны на знак змены роляў надзявалі школьную форму, то цяпер пануе іншы стыль адзення, і педагогі вырашылі аддаць перавагу «дзелавым» джынсам і модным кашулям.

На школьнай ранішняй лінейцы вучні аб'яўляюць дарослым распарадак дня. Самі дзеці будуць праводзіць для настаўнікаў урокі, прынамсі, запланаваны фізіка і музыка, але магчымы і сюрпрызы.

Сёлета ў Цяхцінскай школе адбудуцца таксама выбары. Выбраць трэба прэзідэнта школьнага парламента: на гэтую пасаду ёсць некалькі кандыдатаў, якія ўжо абнародавалі сваю праграму дзеянняў. Зрабіць свой выбар можна будзе на перапынках: галасаванне тайнае — падрыхтаваны скрыні і бюлетэні. Калі ўвесь Дзень самакіравання нагадвае спектакль — вясёлы і павучальны адначасова, то выбары кіраўніка школьнага парламента — гэта справа даволі сур'ёзная. У школьным жыцці ўвесь год задзейнічана самакіраванне, і выбраны прэзідэнт будзе прадстаўляць інтарэсы цяхцінскіх вучняў да канца сваёй вучобы ў школе.

Ілона ІВАНОВА.

СЛУЖЫЦЬ УСЁЙ СЯМ'ЁЙ

13 сем'яў прызнаны пераможцамі шостай рэспубліканскай акцыі Міністэрства ўнутраных спраў «Сям'я! Служым разам!».

Сям'я Клімчэняў — у ліку ўзнагароджаных. Галава сям'і Вячаслаў Сяргеевіч — намеснік начальніка факультэта завочнага навучання Акадэміі МУС — удзельнічае ў культурных мерапрыемствах, вядзе здаровы лад жыцця. Жонка Наталля Вячаславаўна — медсястра ў паліклініцы МУС. Яе хобі — духмяная выпечка і фларыстыка. Старэйшая дачка Таццяна вучыцца па эканамічнай спецыяльнасці, вывучае англійскую і іспанскую мовы, займаецца спортам. Бацька і дачка неаднойчы выступалі ў складзе каманды акадэміі на спартыўных святах. Малодшая дачка — вучаніца Яна — добра малюе, захапляецца тэнісам. Сям'я Клімчэняў шмат падарожнічае па гістарычных мясцінах Беларусі, наведвае музеі, тэатры, выставы.

Пераможцы акцыі — гэта сем'і, якія ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці падраздзяленняў, арганізацыі вольнага часу, падтрымліваюць агульны маральна-псіхалагічны клімат. Сёлета ў межах акцыі праводзіўся і конкурс дзіцячых малюнкаў па сюжэтах з міліцэйскага жыцця.

Святлана БАРЫСЕНКА

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 07 октября 2013 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых. Срок, дни: 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	44,00	45,00	45,30	46,50	46,80	47,10	47,40	9,00	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50
1 000 001 – 10 000 000	44,10	45,10	45,40	46,60	46,90	47,20	47,50	9,25	9,75	10,25	10,75	11,25	11,75
10 000 001 и более	44,20	45,20	45,50	46,70	47,00	47,30	47,60	9,50	10,00	10,50	11,00	11,50	12,00
Доллары США													
1 – 500	4,80	5,10	5,40	5,60	6,10	6,40	6,70	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	4,90	5,20	5,45	5,70	6,20	6,45	6,80	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	5,00	5,30	5,50	6,00	6,30	6,50	7,00	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Евро													
1 – 500	4,80	5,10	5,40	5,60	6,10	6,40	6,70	3,00	3,80	4,40	4,80	5,20	5,60
501 – 5 000	4,90	5,20	5,45	5,70	6,20	6,45	6,80	3,30	4,00	4,60	5,00	5,40	5,80
5 001 и более	5,00	5,30	5,50	6,00	6,30	6,50	7,00	3,60	4,20	4,80	5,20	5,60	6,00
Российские рубли													
1 – 15 000	6,30	6,60	6,90	7,10	7,60	7,90	8,20	4,50	5,30	5,90	6,30	6,70	7,10
15 001 – 150 000	6,40	6,70	6,95	7,20	7,70	7,95	8,30	4,80	5,50	6,10	6,50	6,90	7,30
150 001 и более	6,50	6,80	7,00	7,50	7,80	8,00	8,50	5,10	5,70	6,30	6,70	7,10	7,50

Настоящие ставки применяются:
для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой в белорусских рублях с 07.10.2013;
для договоров срочного банковского вклада (депозита) с плавающей процентной ставкой в долларах США, евро и российских рублях, заключенных с 06.03.2006 до 01.09.2013 – с 08.11.2013.

Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2012 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

	Январь	Февраль	Март	Апрель	Май	Июнь	Июль	Август	Сентябрь	Октябрь	Ноябрь	Декабрь	Итого
Срочные вклады (депозиты)	98 253 076,1	107 251 486,6	129 307 156,0	135 580 785,5	125 213 163,6	102 674 286,8	94 625 390,9	91 808 015,4	82 961 944,5	96 867 085,9	98 367 013,3	110 701 552,4	1 273 610 956,9
До востребования	2 435 875,6	3 038 153,9	3 399 503,8	3 507 658,0	4 097 252,6	3 429 146,8	3 405 457,7	3 829 635,2	3 704 628,0	4 047 605,3	3 615 067,0	4 031 164,7	42 541 148,6

Процентная ставка по вкладу (депозиту) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договором банковского вклада (депозита).

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

